Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

Комуністычная Партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і Мінскага Абкома КП(б)Б

№ 289 (6868) | 15 снежня 1940 г., нядзеля | ЦАНА 10 КАП.

СЁННЯ ВЫБАРЫ У МЯСЦОВЫЯ СОВЕТЫ ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ У ЗАХОДНІХ АБЛАСЦЯХ

УСЕ НА ВЫБАРЫ!

ГАЛАСУЙЦЕ ЗА КАНДЫДАТАЎ СТАЛІНСКАГА БЛОКА КОМУНІСТАЎ І БЕСПАРТЫЙНЫХ!

УСЕ НА ВЫБАРЫ!

Сёння працоўныя заходніх абласцей СР выбіраюць дэпутатаў у мясцовыя ганы совецкай улады—абласныя, гарад-я, раённыя, сельскія і пасялковыя Со-ты дэпутатаў працоўных. У гэты-ж нь будуць выбіраць мясцовыя советы зваленыя народы заходніх абласцей тняй Украінскай ССР.

У шэсць гадзін раніцы гасцінна рас-няцца дзверы выбарчых участкаў. аслівыя выбаршчыкі ўвойдуць туды, сапраўдныя гаспадары сваёй зямлі, йго лёсу. Сталінская Канстытуцыя да-грамадзянам краіны Совецкай вялікія тітычныя правы. Такіх правоў не мае е ведае насельніцтва капіталістычных кін.

ыбары будуць вялікім усенародным гам, святам совецкай социялістычнай кратыі. Яны будуць праведзены ў най адпаведнасці з Палажэннем аб вы-х на аснове Сталінскай Канстытуцыі. ін будуць усеагульнымі, роўнымі, пра-мі, пры тайным галасаванні.

се грамадзяне заходніх абласцей, да-лаўшыя 18 год, незалежна ад вераспа-ння, адукацыйнага цэнза, аседласці, сіяльнага паходжання, маемаснага стовішча і ранейшай дзейнасці маюць а ўдзельнічаць у выбарах і быць ванымі. Такія сапраўды дэмакратыч-выбары могуць быць толькі ў адной не, у вялікай краіне социялізма, дзе адаром жыцця з'яўляецца сам народ, кіемы партыяй Леніна—Сталіна.

трэці раз насельніцтва заходніх аб-ей будзе свабодна галасаваць за сваіх дных выбраннікаў. Зноў і зноў яно параўноўваць тое, што было так ўна да вызвалення, што знікла як ь, праклятае народам, і тое, што есла з сабой, што дала совецкая ўлада. і тры месяцы яркае социа Сталін-Канстытуцыі азарае ўзноўленае ё гарадоў і сёл заходніх абласцей. эты невялікі гістарычны тэрмін да-ут вялікі росквіт духоўных і матэ-льных сіл народа.

прамысловасці, сельскай гаспадарцы, ліне культуры — усюды кіпіць твор-работа. Социялізм раскрыў перад роўнымі шырокія гарызонты, яркія ектывы. Горда глядзяць уперад ма-ы совецкія грамадзяне, адчуваючы ўдзельнікамі вялікай социялістычнай лі.

лікі Сталін, партыя большэвікоў валі і абудзілі таленты зтольнас-рода, які на працягу дваццаці год нятаўся польскімі намешчыкамі і ка-стамі.

лікі Сталін, партыя большэвікоў далі соціялістычную дзяржаўнасць, далі ў адну квітнеючую Беларускую кую Социялістычную Рэспубліку, далі ў адну брацкую сям'ю совецкіх раў.

Партыя ўзняла да дзяржаўнай дзейнасці тысячы і тысячы людзей з гушчы народа. 18 тысяч чалавек вылучаны на адказную дзяржаўную, гаспадарчую і культурную работу ў заходніх абласцях.

Пад сцягам партыі Леніна—Сталіна пойдуць сёння да выбарчых урнаў працоўныя Беластоцкай, Брэсцкай, Баранавіцкай, Пінскай, Вілейскай абласцей. Яны аддадуць свае галасы кандыдатам сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

Кандыдатамі ў дэпутаты мясцовых советаў працоўныя вылучылі верных сыноў і дачок радзімы, гатовых верай і праўдай змагацца за справу народа, за справу социялізма. Сярод кандыдатаў у дэпутаты Беластоцкага абласнога совета — стары ткач Сігізмунд Пятровіч Касуўскі, вылучаны на адказную гаспадарчую работу, і малады селянін-калгаснік Канстанцін Говар — арганізатар калгаса ў вёсцы Баранава, Гродненскага раёна.

Слаўная дачка беларускага народа Аляксандра Іванаўна Федасюк балатыруецца ў Брэсцкі абласны Совет дэпутатаў працоўных. Вылучаная старшынёй Кобрынскага гарадскога совета, яна сваёй дзейнасцю заваявала аўтарытэт і любоў усяго насельніцтва горада.

Выбаршчыкі Баранавіцкай абласці будуць галасаваць за такіх людзей, як настаўніца юшэвіцкай школы, Несвіжскага раёна, Анастасія Жураўская, як старшыня Драчылаўскага сельсовета Павел Стома і многа іншых простых і чэсных совецкіх людзей. Усю сваю энергію і злольнасці аддаюць яны справе социялістычнага будаўніцтва.

Пралетаўнікі рабочых, сялян, совецкай інтэлігенцыі — вось хто будуць выбраннікамі народа. У гэтым і выражаецца веліч совецкай улады, Сталінскай Канстытуцыі, социялістычнага дэмакратызма.

Падрыхтоўку да выбараў працоўныя заходніх абласцей азнаменавалі слаўнымі перамогамі. Дзесяткі прадпрыемстваў датэрмінова выканалі гадавыя планы. Велізарны палітычны і вытворчы ўздым сярод працоўных з'яўляецца залогам таго, што выбары будуць праведзены дружна і арганізавана, пры стопроцантнай яўцы ўсіх выбаршчыкаў.

Аддаючы свае галасы за кандыдатаў сталінскага блока, працоўныя заходніх абласцей будуць галасаваць за далейшы росквіт сваёй вялікай радзімы, за партыю большэвікоў, за роднага Сталіна, які вядзе вялікую сям'ю совецкіх народаў да новых перамог комунізма.

Актыўным удзелам у выбарах забяспечым новую перамогу сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

Усе на выбары!

Фотакампазіцыя В. Пагосцера.

ПАМЯЦІ ВЯЛІКАГА ЛЁТЧЫКА

Сёння совецкі народ адзначае другую ану з дня смерці вялікага лётчыка ша часу—Валерыя Паўлавіча Чкалава. снежня 1938 г. у рэзультаце па-рай катастрофы не стала выдатна-ота, сталінскага выхаванца і лю-народа. Дрогнулі сэрцы мільёнаў, апранулася ў глыбокую жалобу. чны выпадак вырваў з радоў слаў-талінскіх сокалаў бясстрашнага увасобіўшага ў сабе ўсе лепшыя совецкіх людзей.

Шчыра страціла ў асобе Валерыя а аднаго з сваіх адданейшых сы-е шкадаваўшага сваіх сіл, сваіх ых здольнасцей для справы кому-для справы Леніна—Сталіна.

Чырвоная Армія страціла ў асобе Чка-ясстрашнага лётчыка-знішчальніка, ага і прыкладнага камандзіра, ад-першых Герояў Совецкага Саюза.

Увесь совецкі народ страціў у асобе пудоўнага, легендарнага героя, льніка шырокіх паветраных пра-мужнага пакарыцеля суровай ціі, піонера новых паветраных шля-

У свае слаўнае жыццё Валерый прысвяціў умацаванню абароназ-сці любімай радзімы, развіццю яе ці, яе паветранай магутнасці. Чкалаў не забываў, што наша краіна— ў свеце социялістычная дзяржа-і што таму ёй патрэбны мацнейшая свеце армія, мацнейшы ў свеце ваен-траны флот.

Свяшчэннай клятвай прагучэлі яго словы сказаныя таварышу Сталіну: «Я ымаць штурвал самалёта да таго акуль у маіх руках ёсць сіла, а чаць зямлю». І ён чэсна выканаў ятву, да апошняй мінуты свайго не выпускаў з рук штурвала са-Ён загінуў на баявым пасту, ўваючы самалёт новай канструк-памагаючы краіне будаваць но-атныя баявыя машыны.

Таварыш Сталін, як бацька, любіў свай-ванца, патрымліваў яго сме-зерзнавенныя шуканні, натхняў гічныя подвігі.

У 36 годзе Валерый Паўлавіч а сваімі баявымі таварышамі елямі Георгіем Байдуковым і Александрам Беляковым зрабіў выдатны беспасадачны пералёт з Масквы на Далёкі Усход. Машына прабыла ў паветры 56 гадзін 20 мінут і пакрыла адлегласць у 9374 кілометры. Востраў Удд, на якім апусцілася гэта легендарная сталёвая птушка, цяпер носіць імя яе слаўнага вадзіцеля—Чкалава. Пуцёўку ў гэты палёт уручыў мужнаму экіпажу вялікі друг совецкіх лётчыкаў, натхнёпель іх перамог таварыш Сталін. Чкалаў і яго таварышы з чэсцю пранесліся па сталінскаму маршруту над неасяжнымі прасторамі совецкай краіны і паказалі ўсяму свету, на што здольны большэвікі, асяляўшыя тэхніку.

Прайшло менш года, і свет даведаўся аб новым подвігу праслаўленай чкалаўскай тройкі багатыроў. На гэты раз яны павялі сваю машыну па новай, зусім нязведанай трасе. Яны праляцелі праз Паўночны полюс, імкліва пранесліся над ледзянымі пустынямі Арктыкі, над скалістымі горамі Паўночнай Амерыкі і праз 63 гадзіны 25 мінут пасля вылету з Масквы пасадзілі свой самалёт на аэрадроме Ванкувер, паблізу Портланда. Сталёвая птушка праляцела каля 12 тысяч кілометраў паветранага шляху. Гэта быў першы ў свеце беспасадачны пералёт па маршруту СССР—ЗША.

І ў гэтым пералёце лётчыкаў натхняла тое-ж імя, з якім яны ляцелі год таму назад,—імя Сталіна. Іх натхняла любоў да радзімы, да свайго народа. Недарма Чкалаў, калі яго запытаў адзін амерыканскі журналіст: «Вы багаты?»—адказаў:

— Так, вельмі багат. У мяне 170 мільёнаў.

— 170 мільёнаў!?—здзівіўся журналіст.—Чаго, рублёў ці даляраў?

— Не, — адказаў Чкалаў, — 170 мільёнаў чалавек, якія працуюць на мяне таксама, як я працую на іх.

У гэтым адказе—увесь Чкалаў.

Памяць аб Валерыі Паўлавічу Чкалаве будзе вечна жыць у сэрцах 193 мільёнаў совецкіх людзей, у іх любві і клопатах аб совецкай авіяцыі. Яна будзе жыць у подвігах смелых і бясстрашных сталінскіх сокалаў, вучняў незабыўнага Валерыя Паўлавіча, якія імкнуцца стаць такімі, як Чкалаў.

Да 100-годдзя Беларускага сельскагаспадарчага інстытута

Гор. ГОРКІ

ПРАФЕСАРАМ, НАВУКОВЫМ РАБОТНІКАМ, ВЫКЛАДЧЫКАМ І СТУДЭНТАМ БЕЛАРУСКАГА СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАГА ІНСТЫТУТА

Цэнтральны Камітэт Комуністычнай партыі (большэвікоў) Беларусі вітае прафесараў, навуковых работнікаў, выкладчыкаў, студэнтаў, рабочых і служачых Беларускага сельскагаспадарчага інстытута са стагоддзем Беларускага сельскагаспадарчага інстытута.

100-гадовы юбілей старэйшай сельскагаспадарчай ВНУ краіны разам з пітомцамі інстытута — прафесарамі, вучонымі і выкладчыкамі — адзначае ўся совецкая агранамічная навука і працоўныя Совецкай Беларусі.

У цяжкіх умовах існаваў інстытут у змрочныя годы царскага самадзяржаўя. Развіццё інстытута і распаўсюджанне сельскагаспадарчых навук усяляк тармазілася.

Толькі пасля перамогі Вялікай Кастрычніцкай социялістычнай рэволюцыі ў СССР для Беларускага сельскагаспадарчага інстытута, як і для ўсіх іншых навуковых установ і навучальных устаноў нашай краіны, наступіла пара поўнакроўнага развіцця і сапраўднага росквіту. Партыя большэвікоў і Совецкі ўрад акружылі Беларускі сельскагаспадарчы інстытут увагай і цёплымі клопатамі.

За гады совецкай улады інстытут даў краіне 3.000 высокакваліфікаваных агрономаў, зоатэхнікаў, гідратэхнікаў, землеўпарадчыкаў і дзесяцітысячную армію спецыялістаў з сярэдняй асветай, г. зн. у два разы больш чым за папярэднія 80 год свайго існавання.

Кадры, выкаваныя ў інстытуце, разам з калгасным сялянствам вядуць упорную барацьбу за працвітанне социялістычнага земляробства і жывёлагадоўлі, за поўнае ажыццяўленне ўказанняў правадыра народаў таварыша **Сталіна** аб штогодняй вытворчасці 8 мільярдаў пудоў зярна, за высокапрадуктыўную грамадскую жывёлагадоўлю ў калгасах і соўгасах, за далейшы рост заможнасці і культуры калгасных мас.

Наша сельская гаспадарка дасягнула велізарных поспехаў. Яна з'яўляецца самай буйнай і механізаванай у свеце. З ростам сельскагаспадарчай социялістычнай вытворчасці выраслі патрабаванні да кадраў спецыялістаў, якія павінны дасканала ведаць і любіць сваю прафесію, быць узброенымі асновамі марксізма-ленінізма.

Цэнтральны Камітэт Комуністычнай партыі (большэвікоў) Беларусі ўлаўнен, што прафесары, навуковыя работнікі, выкладчыкі Беларускага сельскагаспадарчага інстытута прыкладуць усе намаганні к таму, каб яшчэ вышэй падняць культуру социялістычнага земляробства, падрыхтаваць для сельскай гаспадаркі новыя атрады высокакваліфікаваных спецыялістаў, рухаючых уперад перадавую навуку, беззаветна адданых справе партыі Леніна—Сталіна і нашай социялістычнай радзіме.

Цэнтральны Камітэт Комуністычнай партыі (большэвікоў) Беларусі.

Горкі, сельскагаспадарчы інстытут

Калектыву навуковых работнікаў, выкладчыкаў, студэнтаў і служачых Горацкага сельскагаспадарчага інстытута ў дзень знамянальнага юбілея — стогадовага існавання адной з лепшых сельскагаспадарчых навучальных устаноў краіны — ЦК комсамола Беларусі ад імя многатысячнай арміі комсамольцаў і моладзі шле сваё гарачае комсамольскае прывітанне.

Цеснымі узамі звязана пладатворная дзейнасць вашага інстытута з моладдзю і комсамолам. Тысячы маладых спецыялістаў сельскай гаспадаркі вышлі са сцен Горацкага сельскагаспадарчага інстытута і зараз плённа працуюць на карысць і працвітанне нашай любімай радзімы.

ЦК комсамола Беларусі жадае вам, дарагія таварышы, і ў далейшым паспяхова рыхтаваць высокакваліфікаваных спецыялістаў сельскай гаспадаркі, выхоўваць адданых барацьбітоў за справу комунізма.

ЦК комсамола Беларусі.

Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР

АБ УЗНАГАРОДЖАННІ ПРАФЕСАРАЎ І РАБОТНІКАЎ БЕЛАРУСКАГА СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАГА ІНСТЫТУТА

У азнаменаванне 100-гадовага юбілея Беларускага сельскагаспадарчага інстытута, за заслугі ў справе развіцця сельскагаспадарчых навук і падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў сельскай гаспадаркі, узнагародзіць прафесараў і навуковых работнікаў інстытута:

ПАЧОТНАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

1. **Вейса** Ювеналія Аляксандравіча — акадэміка Акадэміі навук Беларускай ССР, доктара тэхнічных навук, прафесара, загадчыка кафедрай механізацыі.
2. **Годнева** Ціхана Нікалаевіча — акадэміка Акадэміі навук Беларускай ССР, доктара біялагічных навук, прафесара, загадчыка кафедрай фізіялогіі раслін.
3. **Гоманава** Егора Пятровіча — кубаўшчыка па ператонцы дысцыліраванай вады, працуючага ў інстытуце 60 год.
4. **Захарава** Сяргея Сцяпанавіча — кандыдата сельскагаспадарчых навук, загадчыка кафедрай агульнага земляробства, намесніка сакратара партыйнага бюро інстытута.
5. **Кафцэвіча** Нікалая Нікалаевіча — прафесара, загадчыка кафедрай фізікі.
6. **Кедрава-Зіхмана** Оскара Карлавіча—акадэміка Акадэміі навук Беларускай ССР, прафесара, доктара сельскагаспадарчых навук.
7. **Красінава** Інакенція Ільіча — прафесара, загадчыка кафедрай неарганічнай хіміі.
8. **Лапо** Аркадзія Іванавіча — члена-карэспандэнта Акадэміі навук Беларускай ССР, кандыдата сельскагаспадарчых навук.
9. **Лубяка** Васілія Нікіціча—акадэміка Акадэміі навук Беларускай ССР, доктара эканамічных навук, прафесара, дырэктара інстытута эканомікі Акадэміі навук Беларускай ССР.
10. **Найдзенава** Нікалая Васільевіча — прафесара, доктара сельскагаспадарчых навук, члена-карэспандэнта Акадэміі навук Беларускай ССР.
11. **Нікалаева** Нікалая Фёдаравіча — прафесара, загадчыка кафедрай батанікі.
12. **Новікава** Дзям'яна Раманавіча — дырэктара фундаментальнай бібліятэкі інстытута.
13. **Папова** Васілія Васільевіча — члена-карэспандэнта Акадэміі навук Беларускай ССР, доктара тэхнічных навук, прафесара, загадчыка кафедрай геадэзіі.
14. **Тішкова** Сяргея Іванавіча — дырэктара сельскагаспадарчага інстытута.

ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

1. **Барабанава** Пятра Нікандравіча — лабаранта сельскагаспадарчага інстытута.
2. **Бязверхава** Міхаіла Кузьміча — дацэнта, загадчыка кафедрай матэматыкі.
3. **Васільчэнка** Васілія Іларыёнавіча — прафесара, загадчыка кафедрай планіроўкі населеных месц.
4. **Гаўрылава** Васілія Іванавіча — кандыдата сельскагаспадарчых навук, дацэнта, намесніка дырэктара інстытута па навукова-даследчай частцы.
5. **Гаранскага** Міхаіла Нікалаевіча — былога аспіранта інстытута.
6. **Грэбеннікава** Пракопія Еўсеевіча — прафесара, загадчыка кафедрай раслінаводства.
7. **Зубрыцкага** Івана Васільевіча — кандыдата сельскагаспадарчых навук, дацэнта па кафедры геадэзіі.
8. **Кадрэвіча** Антона Антонавіча — загадчыка кафедрай начартацельнай геаметрыі.
9. **Кажушка** Канстанціна Вікенцьевіча—загадчыка складамі інстытута, прапрацаваўшага ў інстытуце 20 год.
10. **Казліхіна** Аляксея Дзмітрыевіча — кандыдата сельскагаспадарчых навук, сакратара партбюро сельскагаспадарчага інстытута.
11. **Ларчэнка** Ефіма Герасімовіча—кандыдата тэхнічных навук, дацэнта па кафедры геадэзіі.
12. **Латушкіну** Матрону Фамінічну — вахцёра фізіка-хімічнага корпуса, прапрацаваўшую ў інстытуце 20 год.
13. **Ленчыкава** Івана Фёдаравіча—загадчыка спецчасткай інстытута.
14. **Лубяка** Сяргея Нікіціча — рабочага-слёсара сельскагаспадарчага інстытута, прапрацаваўшага ў інстытуце 22 годы.
15. **Макаро** Ігнація Лукіча — дацэнта, загадчыка кафедрай арганічнай хіміі.
16. **Самбікіна** Міхаіла Мітрафанавіча—прафесара, загадчыка кафедрай метэаралогіі.
17. **Чэркесава** Фядота Дзмітрыевіча — прэпаратара кафедры механізацыі, прапрацаваўшага ў інстытуце 26 год.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР Н. НАТАЛЕВІЧ.
Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР Л. ПАПКОЎ.

14 снежня 1940 г., г. Мінск.

Г. ГОРКІ

ПРАФЕСАРАМ, НАВУКОВЫМ РАБОТНІКАМ, ВЫКЛАДЧЫКАМ І СТУДЭНТАМ БЕЛАРУСКАГА СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАГА ІНСТЫТУТА

Совет Народных Камісараў Беларускай ССР горача вітае прафесараў, навуковых работнікаў, выкладчыкаў, студэнтаў і ўвесь калектыў работнікаў Беларускага сельскагаспадарчага інстытута ў сувязі са стагоддзем з дня яго аснавання.

Інстытут выхаваў у сваіх сценах тысячы высокакваліфікаваных спецыялістаў сельскай гаспадаркі і даў краіне віднейшых вучоных з сусветнымі імёнамі, паклаўшых пачатак рускай агранамічнай навуцы.

Нямала выхаванцаў Беларускага сельскагаспадарчага інстытута можна сустрэць на самых адказных участках социялістычнай сельскай гаспадаркі. Пітомцы інстытута паказваюць выдатныя ўзоры работы ў калгасах, соўгасах і МТС.

Растучая социялістычная сельская гаспадарка прад'яўляе навуцы, вучоным і спецыялістам сельскай гаспадаркі ўсё новыя і новыя патрабаванні. Задачы, пастаўленыя XVIII з'ездам ВКП(б) і таварышам Сталіным аб штогодняй вытворчасці 8 мільярдаў пудоў зярна, значным расшырэнні пасеваў тэхнічных культур, павелічэнні паталоўя жывёлы і яе прадуктыўнасці, адкрылі перад людзьмі навукі, спецыялістамі сельскай гаспадаркі новыя велізарныя перспектывы ў іх рабоце.

Вышэйшыя і сярэднія сельскагаспадарчыя навучальныя ўстановы павінны даць социялістычнаму земляробству новыя кадры спецыялістаў, гатовых прыкласці ўсе сілы да таго, каб, апіраючыся на практыку і вопыт перадавікоў калгаснай вытворчасці, абагачаючы яе данымі перадавой навукі, яшчэ вышэй узняць культуру социялістычнага земляробства.

Совет Народных Камісараў БССР выражае цвёрдую ўпэўненасць, што інстытут з чэсцю выканае сваю пачотную задачу па падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў сельскай гаспадаркі, яшчэ шырэй разгорне навукова-даследчую работу і будзе ўсямерна ўнядраць дасягненні перадавой агранамічнай мысліў калгасную вытворчасць.

Няхай жыве перадавая совецкая навука!

Няхай жыве геній чалавецтва — вялікі Сталін!

Совет Народных Камісараў БССР.

ПРАВЫ І АБАВЯЗКІ КВАТЭРАНАЙМАЛЬНІКАЎ

Пастанова пленума Вярхоўнага суда СССР

Пленум Вярхоўнага Суда СССР устанавіў, што судовыя органы дапускаюць сур'ёзныя памылкі пры разглядзе жыллёвых спраў. У сувязі з гэтым судам дан рад указанняў.

Рабочыя і служачыя, пражываючыя ў дамах прадпрыемстваў, маюць права карыстацца прадастаўленай ім жыллёвай толькі на час дзеяння працоўнага дагавора. З моманту астаўлення работы на даным прадпрыемстве яны і члены іх сям'і трацяць гэтае права і могуць быць выселены ў адміністратыўным парадку.

Нельга высяляць у адміністратыўным парадку асоб, пераведзеных на другую работу, перайшоўшых на інваліднасць, членаў сямей прызваных у Чырвоную Армію і іншых.

З'ёмшчык жылой плошчы не мае права пераўступаць яе другім асобам у самастойнае карыстанне. Жахары, уселеныя з'ёмшчыкам на стварыўшыяся яго лішкі жылой плошчы ў выглядзе асобнага пакоя, становяцца самастойнымі з'ёмшчыкамі.

Калі ў кватэры аслабанёўся праходны або сумежны з ім пакой і яго нельга перарабіць у ізаляваны, ён перадаецца ў карыстанне ўладальніку сумежнага пакоя.

Часовыя жыхары самастойнага права на займаемую плошчу не маюць. Умовы карыстання імі гэтай плошчай вызначаюцца пагаднеццем.

Калі з'ёмшчык сістэматычна здае асобны ізаляваны пакой у спекулятыўных мэтах, хоць-бы ён і не з'яўляўся лішнім, гэты пакой можа быць із'ят жыллёвым упраўленнем.

З'ёмшчыкі, часова пакінуўшыя сваю жыллёвую плошчу без броні, трацяць на яе права па сканчэнні шасці месяцаў пасля выбыцця іх з дома, хоць-бы яны і не былі адзначаны ў дамавой кнізе як выбыўшыя. Астаўшыяся на іх плошчы жыхары — не члены іх сямей — могуць быць выселены не залежна ад тэрміна пражывання іх на гэтай плошчы.

Пленум абавязаў таксама суды ўзмацніць барацьбу з неплацельшчыкамі кватэрнай платы. (ТАСС).

Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР

АБ ПРЫСВАЕННІ ЗВАННЯ ЗАСЛУЖАНАГА ДЗЕЯЧА НАВУКІ БССР ПРАФЕСАРАМ БЕЛАРУСКАГА СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАГА ІНСТЫТУТА

За выдатныя заслугі ў галіне сельскагаспадарчай навукі прысвоіць званне Заслужанага дзеяча навукі БССР:

1. **Вейсу** Ювеналію Аляксандравічу — акадэміку Акадэміі навук Беларускай ССР, доктару тэхнічных навук, прафесару, загадчыку кафедрай механізацыі.
2. **Кедраву-Зіхману** Оскару Карлавічу —акадэміку Акадэміі навук Беларускай ССР, прафесару, доктару сельскагаспадарчых навук.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР Н. НАТАЛЕВІЧ.
Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР Л. ПАПКОЎ.

14 снежня 1940 г., г. Мінск.

Узнагароджанне Беларускага сельскагаспадарчага інстытута

Беларускі сельскагаспадарчы інстытут (Горкі, Магілеўскай абласці) свят-е 1 снежня свой стогадовы юбілей. стут удзельнічаў на Усесаюзнай льскагаспадарчай выстаўцы гэтага года. поспехі ў падняцці социялістычнага ства і жывёлагадоўлі рэспублікі Галоўвыстаўком 14 снежня прысудзіў інстытуту дыплом першай ступені.

Сем прафесараў і выкладчыкаў інстытута—удзельнікаў выстаўкі — узнагароджаны залатымі і сярэбранымі медалямі. У ліку ўзнагароджаных акадэмік Вейс, доктар тэхнічных навук Папоў, дырэктар інстытута Тішкоў, прафесар Красікаў і іншыя.

УСЕ НА ВЫБАРЫ!

ГАЛАСУЙЦЕ ЗА КАНДЫДАТАЎ СТАЛІНСКАГА БЛОКА КОМУНІСТАЎ І БЕСПАРТЫЙНЫХ!

Кандыдаты вызваленага народа. На здымку (злева направа): Ю. Якімовіч — кандыдат у дэпутаты Беластоцкага абласнога Совета дэпутатаў працоўных. А. Жудро — кандыдат у дэпутаты гарадскога совета гор. Баранавічы. Е. Дульчэўская — кандыдат у дэпутаты Брэсцкага абласнога Совета дэпутатаў працоўных. А. Вальнец — кандыдат у дэпутаты Вілейскага абласнога Совета дэпутатаў працоўных. П. Грабень — кандыдат у дэпутаты Пінскага абласнога Совета дэпутатаў працоўных.

УСЕНАРОДНАЕ СВЯТА

Сотні тысяч грамадзян Беластоцкай вобласці сёння прыдуць да выбарчых урнаў выбіраць дэпутатаў у мясцовыя органы ўлады. Кандыдатамі ў дэпутаты працоўныя вылучылі лепшых сыноў і дачок народа, правяўшых на практычнай рабоце свае асабістыя якасці і бязмежную адданасць радзіме. Беластоцкія тэкстыльшчыкі паслалі ў абласны совет ткачоў—Сігізмунда Каеўскага, Спефана Ленартоўскага, Ізраіля Курыльскага, Спефаніду Жыўлюк і іншых.

Гэта—вылатная плеяда тэкстыльшчыкаў, якія першымі паднялі сцяг стаханаўскага руху на прадпрыемствах і штодзённа працуюць над умацаваннем вытворчай дысцыпліны, над павышэннем прадукцыйнасці працы. Дзякуючы ім — ініцыятарам, сацыялістычнае спаборніцтва на тэкстыльных прадпрыемствах Беластока прыняла шырокі размах, і тэкстыльшчыкі датэрмінова выканалі сваё гадавое заданне, даўшы краіне 10,5 мільёна метраў шарсцяных тканін.

Рабочыя Беластоцкага чыгуначнага дэпо вылучылі сваім кандыдатам у абласны совет Люцыана Іванавіча Партынскага. З малых год тав. Партынскі стаў рэвалюцыянерам. За забойства здрадніка рабочага класа, правакатара панскі суд прыгаварыў 19-гадовага Люцыана да пажыццёвай катаргі. Толькі дзякуючы Чырвонай Арміі Люцыан Партынскі ўбачыў свабоду.

Рабочыя Аўгустоўскай МТС і сяляне гэтага раёна вылучылі кандыдатам у абласны совет Елену Пілецкую—19-гадовую трактарыстку, перадавую жанчыну сяла. 60-гадовы селянін Міхаіл Галіцкі—кандыдат ад вёскі Карыйск, Беластоцкага раёна. Усе яны—перадавікі ў будаўніцтве новага жыцця.

Сёння падводзяцца вынікі праробленай за 2 месяцы выбарчай кампаніі гіганцкай работы. 80 тысяч агітатараў і членаў выбарчых камісій працавалі сярод насельніцтва. 300 тысяч выбаршчыкаў былі ахвачаны гурткамі. Праведзены тысячы мітынгаў, сходаў, сустрэч з кандыдатамі, гутарак. Агітатары — перадавыя людзі вёскі і горада—расказвалі выбаршчыкам на іх роднай мове аб Сталінскай Канстытуцыі, аб прадстаячых выбарах і на мясцовых фактах паказвалі, што даў першы совецкі год працоўным. Гэтых фактаў многа ў кожным горадзе, у кожнай вёсцы. Многія калгасы ўжо ў гэтым годзе атрымліваюць да 10 кілограмаў зярна на працадзень і да 30 кілограмаў бульбы. Рабочыя значна павялічылі прадукцыйнасць працы.

Выбарчая кампанія выклікала ў вобласці палітычны і вытворчы ўздым. Кожнае прадпрыемства, кожны калгас бралі на сябе канкрэтныя вытворчыя абавязацельствы. Кожны дзень атрымліваюцца паведамленні аб ажыццяўленні гэтых абавязацельстваў. Днямі выканаў свой гадавы план Трэст будаўнічых матэрыялаў. Калгасы і сёлы датэрмінова разлічыліся з дзяржавай па ўсіх абавязацельствах. Ластаткова сказаць, што па выкананню фінансавага плана наша вобласць займае другое месца ў Совецкім Саюзе і першае ў рэспубліцы.

Няма сумнення, што новыя советы, ўзначаляць ініцыятыву народа і дабіўшыся яшчэ большых поспехаў у будаўніцтве сацыялістычнага грамадства.

С. МАЛЬЦАЎ,
старшыня Беластоцкага аблвыканкома.

ЗА КАНДЫДАТАЎ НАРОДА

Настала радаснае свята—дзень выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных. У гэты дзень мы аддадзім свае галасы за лепшых сыноў і дачок нашай радзімы, прагаласуем за новае, шчаслівае жыццё.

Мы добра ведаем, каму абавязаны новым жыццём Вызвалены народ яшчэ і яшчэ раз шчыра дзякуе дарагому правадыру таварышу Сталіну за радасць жыцця.

Нашым кандыдатам у дэпутаты абласнога совета з'яўляецца калгасніца сельгасарцелі імені Варашылава Пінскага раёна Хрысціна Наварка. Мы ведаем яе як адданую дачку народа. Толькі совецкая ўлада вывела былую бяднячку на светлы шлях, далучыла яе да актыўнага грамадскага жыцця.

Ля выбарчых урнаў мы аднадушна прагаласуем за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

Выбаршчыкі вёскі Пасенічы, Пінскага раёна, К. МАРЦІНОВІЧ, Н. МАЛІЦКІ.

РАДАСЦЬ ПАЛЕССЯ

Радасныя дні перажывае вызваленае ад панскай няволі Палессе. 15 снежня — дзень выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных — мы сустракаем новымі вытворчымі поспехамі.

Па волі партыі і совецкага ўрада пабудован ў рэкордна кароткі тэрмін Днепра-Бугскі канал. Рабочыя запалкавай фабрыкі імені 17 верасня змагаюцца за датэрміновае выкананне гадавога плана. Буйнейшы ў вобласці пінскі мясакамбінат перавыканаў сваю гадавую праграму. Дзесяткі прамысловых арцелей заваявалі пяршынства ў сацыялістычным спаборніцтве з арцелямі Вілейскай вобласці. Працуюць дзесяткі рэканструяваных і нанова адбудаваных лесапільных заводаў, буйнейшыя ў рэспубліцы фанерныя заводы.

На ўскраіне Пінска, дзе ў 1939 годзе стаялі абломкі згарэўшай дзесяць год назад пільні, пабудаваны механічны майстэрні і цэхі дрэваапрацоўчай арцелі «Рэкорд». У ёй працуе 65 былых беспрацоўных, якія ўжо далі прадукцыі на 500 тысяч рублёў.

Тысячы рабочых сталі стаханаўцамі, працуюць агітатарамі, многія з іх заслужылі давер'е народа — вылучаны кандыдатамі ў дэпутаты мясцовых советаў.

Запалкавая фабрыка імені 17 верасня, дзе я працую, раней працавала 3—4 дні ў тыдзень. Сяляне Палесся пчаналі кожную запалку па дзве і чатыры частачкі, карысталіся крэсівам. А фабрыка з-за капіталістычнай канкурэнцыі прастойвала і выпускала ў месяц не больш 400 скрынак запалак. З устанаўленнем совецкай улады фабрыка рэканструіравана і дае 1.600 скрынак запалак за адны суткі. Цяпер за суткі выпускаецца столькі прадукцыі, колькі пры польскіх капіталістах вырабляліся за 4 месяцы.

У далёкае мінулае адышла нацыянальная варожасць, якая распальвалася польскімі капіталістамі. Беларуска Раіса Лазіцкая, полька Вера Любецкая і яўрэйка Сара Дрыжун спаборнічаюць паміж сабой, дружна змагаюцца за новыя вытворчыя поспехі. Усе трое вылучаны кандыдатамі ў дэпутаты мясцовых советаў. Гэта верныя дочкі народа, адданыя справе партыі Леніна—Сталіна, сваёй сацыялістычнай радзіме.

На фабрыцы ў новым, совецкім калектыве абнавілася ўсё жыццё. Разам з чурачным і пераабсталяваным этыкетыровачным цэхамі пабудаваны пажарнае дэпо і вадаём, заканчваецца сталовая на 300 чалавек, адкрыты дзіцячыя яслі на 120 чалавек, дзіцячы сад на 100 чалавек. Заканчваецца пабудова новага жылога дома для рабочых.

На ўсебярэжжы Прыпяці і Піны, дзе людзі 20 год шукалі свайго кавалка шчасця, заззялі праменні Сталінскай Канстытуцыі.

В. Р. НЯМЫТАЎ,
дэпутат Вярхоўнага Совета БССР, намеснік начальніка аўтаматна-набівачнага цэха пінскай запалкавай фабрыкі імені 17 верасня.

За шчасце нашых дзён

Вёска Пінкавічы многа бачыла на сваім вяку. У 1905 г. па нашых вузкіх палосках гарцавалі ўраднікі і стражнікі, палохаючы сялян расправамі за бунты. А потым наехалі казакі і захвацілі нашых хлопцаў, а разам з імі нашага настаўніка, цяпер народнага паэта Якуба Коласа і пагналі ў Пінск у турму.

У 1920 годзе на нашу вёску прышла новая навала: вярнуліся папы Скірмунты і падпанкі. І дзесяткі беззямельных сялян нашай вёскі пакідалі свае сядзібы і рыбацкую снасць і ішлі ў горад шукаць работы.

Але і ў горадзе закон і правы былі на баку пана.

Толькі ў верасні 1939 г. прышоў канец здзекам над народам.

Сялянам далі зямлю. Павыцягвалі мы свае рыбалоўныя снасці. У многіх не было кароў, іх дала совецкая ўлада. У нас ёсць цяпер свая родная беларуская школа, дзе вучыцца 280 дзяцей. Адкрыт клуб. У бібліятэцы налічваецца да 2 тыс. розных цікавых кніг.

10 лепшых прадстаўнікоў сваёй вёскі мы вылучылі кандыдатамі ў дэпутаты Пінкавіцкага сельскага совета. Сярод іх: Сідар Панада, які працуе цяпер старшынёй сельсовета, перадавая сялянка-актывістка Параска Крышчук.

Кандыдатам у раённы Совет дэпутатаў працоўных мы вылучылі свайго лепшага земляка, селяніна-бедняка Антона Козіча. Ён чэсны чалавек, гарой стаіць за працоўных, за совецкую ўладу.

Усе нашы кандыдаты—верныя сыны народа. За іх мы сёння аддадзім свае галасы.

Сяляне вёскі Пінкавічы, Пінскага раёна: Ф. КАЗЛЯКОЎСКІ, А. КОЗІЧ, З. ЯЦЭВІЧ, С. ПАНАДА, ЛЮБА ШВЭЦ, Ф. МАНЮКЕВІЧ, ТАЦЯНА ЯЦЭВІЧ, О. КОЗІЧ, ЛЮБА АДАМЕНКА.

БЕЛАСТОЦКІЯ ТКАЧЫ

Небывалы, казачны наступіў час. Кожны дзень прыносіў з сабою нечуваныя навіны. Падзеі, як у вадавароце, кружыліся, даганяючы і пераганяючы адна другую.

— Вы ўжо чулі? Советы прымусілі гэтых крывапіўцаў-гаспадарчыкаў павысіць усім рабочым зарплату. З панядзелка, значыцца, пачнецца.

— Баста! Далоў фабрыкантаў! Учора іх па-добраму папрасілі змыцца. Прадпрыемствы нацыяналізаваны — зразумелі? Гэта значыць пашынскімі сталі.

— Вось гэта навіна!

Людзі ўжо ўцягнуліся ў гэтыя штодзённыя падзеі. Задоўга да пачатку работы збіраліся ў цэхі тэкстыльшчыкі. Яны спяшаліся падзяліцца навінамі, — не сядзелася дома.

Тэкстыльныя прадпрыемствы Беластока з кожным днём мянялі сваё аблічча. Групы фабрык былі аб'еднаны ў тэкстыльныя камбінаты з закончаным вытворчым цыклам. Цэхі перайшлі на двухзменную работу. У горадзе не стала беспрацоўных, наадварот, пачаў адчувацца недахоп кваліфікаваных рук.

У тыя дні пованазначаны дырэктар VI камбіната тав. Гімпельсон склікаў рабочы актыў. Ён расказаў сабраўшымся аб большэвіцкім плане рэканструкцыі камбіната, аб стаханаўскім руху і выказаў упэўненасць, што не сёння—заўтра, і сярод іх знойдуцца рабочыя, якія перайдуць на абслугоўванне 2—4 станкоў і заваююць слаўнае імя стаханаўца.

Словы аб ліквідацыі навечна беспрацоўя, аб плане будаўніцтва і рэканструкцыі, як праменні веснавога сонца, грэлі сэрцы рабочых, зводзілі іх губы ў радасныя ўсмешкі. Але ў тое, каб хто з іх змог працаваць на двух і больш станках, не верылі. Вельмі выразна стаяла перад вачыма мінулае. Год назад, калі-б ткач рашыўся працаваць на двух станках,— то першы дзень работы стаў-бы апошнім днём яго жыцця. Сотні беспрацоўных, чые сем'і тыднямі сядзелі без хлеба, разарвалі-б нагляца, заняўшага два месцы на фабрыцы. Усё-ж словы дырэктара аказаліся насеннем, кінутым у спрыяючую глебу.

28-гадовы ткач І. Курыльскі лічыўся сярод тэкстыльшчыкаў актыўным, перадавым рабочым. Пры ўладзе польскіх памешчыкаў і капіталістаў ён прымаў дзейны ўдзел ва ўсіх забастоўках, арганізоўваў слуханне радыёперадач з Совецкага Саюза. Пасля прыходу Чырвонай Арміі рабочыя выбралі тав. Курыльскага старшынёй цэхавога камітэта. Слова «стаханаўцы» і іх справы былі яму ўжо знаёмы. Ім аўладала моцнае жаданне стаць стаханаўцам, працаваць на двух станках. Сваімі мыслямі ён падзяліўся з маткай—вопытнай тэкстыльшчыцай і братамі-ткачамі. Тыя параілі — можна паспрабаваць.

Праз некалькі тыдняў Курыльскі падаў у дырэкцыю камбіната заяву аб сваім жаданні перайсці на работу на двух станках. Некаторыя з цікавасцю чакалі рэзультатаў, але многія адносіліся да гэтага скептычна: раней ніколі не бывала, значыць і цяпер нематчыма.

— Я 55 год працую на фабрыках,— сказаў Курыльскаму стары ткач Мазур, — і ніколі не бачыў, каб рабочы працаваў на двух станках.

У гэты вечар Курыльскі нікуды не пайшоў. Разгавор з Мазуром вышесніў усе іншыя мысліі.

— Ну добра, старык за 70 год свайго жыцця гэтага не бачыў! А совецкую ўладу ён раней бачыў? А каб працавалі без фабрыкантаў, каб рабочы чалавек стаў гаспадаром у краіне — гэта ён сустракаў? Раней! Гэта слова раздражняла ткача. Якое параўнанне, што за жыццё было пры панах! Новае жыццё, па-новаму трэба працаваць. Паспрабуем...

У нядзелю Курыльскі разам з майстрам цэха пераставілі два сумежныя станкі, дэтальна праверылі іх, пачысцілі. Назаўтра энтузіяст прышоў на гадзіну раней, яшчэ раз праверыў станкі, змазаў кожную дэталь і, калі пачалася змена, адзін за адным пусціў іх у ход. Колькі было вачэй у цэху, усе касіліся ў бок. То адзін, то другі падыходзілі давацца, як справы.

— Глядзіце самі, станкі працуюць пот з мяне не льецца, звычайная справа, — спакойна адказваў Курыльскі, і бы ўсё жыццё ён працаваў на двух станках.

К канцу дня ўвесь цэх быў здзіўлены лічбай: 78 тысяч. Аўтаматычныя шчоткі сведчылі, што Курыльскі зрабіў 78 тысяч уточын пры норме 36 тысяч на кожны станок. Гэта была чарговая ткача-наватара. І ў наступныя дні не было выпадку, каб двухстаночнік не выконваў нормы. На дошцы паказальніка супроць яго прозвішча заўсёды значылася 115—120 процантаў.

Праз два тыдні падалі заявы пераходзе на два станкі яшчэ 16 рабочых. На двух станках стаў працаваць у другую змену і 16-гадовы юнак-брат Курыльскага. Неўзабаве юнак стаў вядучым стаханаўцам у цэху. Кожнаму свайму паслядоўніку Курыльскі дапамагаў парадай і справай. Старшы брат ткач III камбіната Х. Курыльскі таксама паследаваў прыкладу перадавых стаханаўцаў.

Перад XVIII з'ездам комуністычнай партыі (большэвікоў) Беларусі ініцыятыва многастаночніцтва ўпёс прапанову назвать цэх іменем з'езда і дабіцца, каб усе рабочыя сталі двухстаночнікамі. Стары Мазур не пратэставаў супроць гэтай прапановы. Ён таксама лічыў, што такую знамянальную падзею трэба сустрэць большэвіцкімі справамі.

Да дня адкрыцця з'езда ткачы з поспехам выканалі сваё абавязацельства. Ткачы цэх імені XVIII з'езда КП(б)Б з часам заваяваў званне стаханаўскага. Па прыкладу перадавога цэха многастаночніцтва распаўсюдзілася па ўсім камбінаце. Дзякуючы гэтаму выдатнаму руху VI камбінат стаў перадавым у горадзе, атрымаў пераходны чырвоны сцяг гарадскога камітэта партыі.

Кожную нядзелю — гэта стала традыцыяй—уся сям'я Курыльскіх збіраецца разам: чатыры ткачы-двухстаночнікі, маці, сёстры. Пакуль на кухні з'яе пліта, кіпіць, смажыцца, бяруць пастройваюць на Маскву новы, купілены радыёпрыёмнік. Ніхто з прысутных не быў у чырвонай сталіцы, але гавораць яны аб ёй з цеплынёй і любоўю. Там жыве вялікі Сталін, які прынёс шчасце і свабоду народу. «Наш стаханаўцаў» — як жартам называюць гэту сям'ю суседзі — абмяркоўвае ўсякія сямейныя і вытворчыя справы. Малодшы хваліцца сваімі поспехамі. На гэтым тыдні ён перагнаў па колькасці зробленых уточын усіх ткачоў, у тым ліку і сваіх братоў. Яшчэ ў мінулым годзе гаспадар плаціў яму за кожную тысячу ўточын па 5 грошаў, тады як дарослыя атрымлівалі па 20 грошаў. Цяпер ён зарабляе 800—900 рублёў у месяц. Заработак двух братоў і маперы дасягае 2.000 рублёў. Маці магла спакойна адпачываць на старасці год, бо яна не хоча кідаць прадпрыемства. Толькі цяпер, гаворыць яна, працаваць стала люба. Не гледзячы на свае 60 год, яна штомесячна перавыконвае норму.

Сям'я стаханаўцаў карыстаецца в камбінаце і ў горадзе вялікай павагай. Калі пачалося вылучэнне кандыдатаў у дэпутаты абласнога совета, на агульным сходзе рабочых VI камбіната першым быў названы ініцыятар руху многастаночніцтва І. Курыльскі. Гэту кандыдатуру падтрымаў сход выбаршчыкаў акругі.

Гэта вялікая чэсць выклікала ў сям'і радасць і энтузіязм. Курыльскі пісаў заяву аб пераходзе на абслугоўванне чатырох станкоў. Гэта — пачатак новага этапа ў стаханаўскім руху на VI камбінаце. Станкі, на якіх працуюць члены сям'і Курыльскіх, штодзённа выпускаюць каля 250 метраў дабротнага трыко і драпа. Уся іх прадукцыя ідзе першым сортам.

Е. УЗДЗЕНСКІ.

ПЕРШЫ СОВЕЦКІ ГОД

Вялікія змяненні адбыліся на тэрыторыі Ашмянскага раёна Вілейскай вобласці за 15 месяцаў існавання совецкай улады. Усюды адчуваюцца сталінскія клопаты аб працоўных, будуецца новае, шчаслівае жыццё. Беспрацоўныя атрымалі работу, беззямельныя—зямлю, дзеці працоўных—права на бясплатнае навучанне.

Толькі па аднаму былому Ашмянскаму павету польскія памешчыкі карысталіся 27.662 гектарамі самай лепшай, пладаноснейшай зямлі. Небезвядомы граф Чапскі ў маёнтку Навасёлак былой Куцэвіцкай воласці меў у сваім карыстанні 1.554 дзесяціны зямлі. Магнат Базаравіч ўладаў маёнткам Баніфацава з зямельнай плошчай у 1.752 дзесяціны зямлі.

Зараз уся зямля памешчыкаў і іх рухомая і нерухомая маемасць, нажытая на крыві і поце батракоў і беднякоў, перадана ў бясплатнае карыстанне народу.

На Ашмянскаму раёну батракам і беднякам раздана 13.794 гектары зямлі. Батракі і беднякі атрымалі 1.173 коней, 2.726 галоў буйнай рагатай жывёлы, 1.465 свіней, 1.186 авечак. Раздана 16.387 пудоў зярна, 27 тысяч пудоў грубых кармоў і т. д. Батракі пана Бішэўскага — Рольба Станіслаў, Кеп Франц, Ляўковіч Станіслаў, Кошчык Гедера, Станчык Соф'я, Мацэвіч Станіслаў і многія іншыя атрымалі па 4—5 гектараў зямлі, коней, кароў, вупраж, збрую і многа дробнай жывёлы.

На землях двух панскіх маёнткаў арганізаваліся калгасы, у якія ўвайшлі батракі, беднякі і сераднякі. Малодым калгасам перададены бясплатна і на вечнае карыстанне многа пладаноснай зямлі, коней, кароў, дробнай жывёлы, сельскагаспадарчы інвентар і машыны належаўшыя па-мешчыкам. Пацрыклад, калгасу імені 1-е Мая (Даргішскі сельсовет) перадана 19 рабочых коней, 30 галоў буйнай рагатай жывёлы і многа дробнай. Калгасу імені 1 верасня (Каспянецкі сельсовет) перадана 18 коней, 30 кароў, 20 свіней, 50 авечак.

Радасна, шчасліва жывуць калгаснікі Свабодная калектыўная праца дае свае выдатныя плады. На адзін працадзень калгаснікі сельгасарцелі імені 1-е Мая атрымліваюць па 4,5 кілограма зернавых, па 5 кілограмаў бульбы. У мінулым годзе ў селяніна Антона Гіруся хлеб быў рэдкім госцем у хаце. Зараз на зямлі, адведзеную працаўні ён атрымае 2.340 кілограмаў зярна, 2.600 кілограмаў бульбы і многа іншых прадуктаў. Такіх прыкладаў у калгасе нямала.

На тэрыторыі цяперашняга Ашмянскага раёна налічвалася 877 беспрацоўных. Зараз усе яны атрымалі работу і працуюць у совецкіх установах, арцелях, на прадпрыемствах.

Дзесяткі здольных людзей, якія раней вялі жабрацкае існаванне, пры совецкай уладзе вылучаны на адказную совецкую і гаспадарчую работу. 18 чалавек працуюць старшынямі сельскіх советаў. Тав. Шаткоўскі Іван Іосіфавіч, у мінулым селянін-бядняк, зараз працуе старшынёй Пагірскага сельсовета. Ён па-большэвіцку спраўляецца з даручанай яму адказнай работай. Пагірскі сельсовет з'яўляецца адным з перадавых у раёне. Тав. Шаткоўскага, як вернага сына народа, да канца адданага вялікай справе партыі Леніна—Сталіна, сяляне вёсак Скуі і Грыгі Горныя вылучылі сваім кандыдатам у дэпутаты раённага совета.

Польскія заправілы ніколі не клапаціліся аб ахове здароўя працоўных і аб матэрыяльным забеспячэнні іх у старасці або пры страце працаздольнасці. Туберкулёз, трахома і іншыя хваробы з'яўляліся сапраўдным бічом працоўных. Сетка медыцынскіх устаноў была настолькі рэдкай, што сялянам прыходзілася шукаць медыцынскай дапамогі за 30—40 кілометраў. Пры ўладзе польскіх паноў селянін Іосіф Вішнеўскі з вёскі Дэбесі, зараз Палянскага сельсовета, заплаціў ураču Браніцкаму толькі за адзін выезд да хворай жонкі 100 злотых, прадаўшы для гэтага апошнюю карову і яшчэ пазычыўшы грошы ў суседзяў.

Совецкая ўлада з першых-жа дзён ажыццявіла тыя вялікія правы грамадзян СССР, якія залатымі літарамі запісаны ў самай дэмакратычнай у свеце Сталінскай Канстытуцыі. На ахову здароўя ў гэтым годзе па раёну асігнавана каля аднаго мільёна рублёў. Працоўным забяспечана бясплатная медыцынская дапамога.

У раёне значна вырасла сетка медыцынскіх устаноў. Адкрыты 4 фельчарска-акушорскія і 1 урачэбны пункты. Значна павялічылася колькасць больнічных коек. Зараз у раёне працуе 13 урачоў і 37 чалавек сярэдняга медыцынскага персанала. У гэтым годзе адкрыт і функцыяніруе радзільны дом, які абслужыў ужо больш 200 рожаніц. З студзеня 1940 г. працуе зубаўрачэбны кабінет, які пры двухзменнай рабоце абслужыў больш 10.000 наведвальнікаў. Ашмянская амбулаторыя ў 1940 г. прыняла 16.166 хворых, на дому абслужана 3.103 чалавекі.

Польскі ўрад прымушаў беларускіх дзяцей вучыцца толькі на польскай мове, забараняў адкрыццё беларускіх школ.

У павеце налічвалася 74 школы, з іх 53 змяшчаліся ў цесных сялянскіх хатах. У школах працаваў 151 настаўнік. Усяго ў 1938-39 вучэбным годзе навучалася 5.811 дзяцей.

У гэтым годзе ў раёне асігнавана на асвету 2.169.200 рублёў. Колькасць навучаючыхся павялічылася да 9.136 чалавек. Працуюць 253 настаўнікі. У раёне налічваецца 88 школ, з іх 79 беларускіх, 6 рускіх, 2 яўрэйскія і 1 польская. За год адкрыта 14 школ, 39 новых класаў. Рад школ пераведзен з сялянскіх хат у былыя памешчыкіх палацы. Пабудаваны 2 новыя школы — у вёсках Бецюнах і Анжадове. Для ізетвары, асуджанай у мінулым на невуцтва і бескультур'е, шырока адчыніліся дзверы ў навуку.

У раёне адкрыты: Дом сацыялістычнай культуры, 11 хат-чытальнь, 8 чырвоных куткоў. Працуюць 33 гурткі мастацкай самадзейнасці, з іх 13 харавых, 13 драматычных, 5 струнных і 2 духавых. У кінатэатры за год совецкай улады дэманстрыравалася 115 кінофільмаў, абслужана 108.200 гледачоў, у раёне дзейнічаюць 2 кінаперасоўкі.

Неймаверна вырасла цяга насельніцтва да газет і журналаў. Раней газеты выпісвалі толькі памешчыкі, чыноўнікі, ксяндзы. Зараз амаль кожны працоўны выпісвае газеты і журналы. У снежні працоўныя раёна атрымліваюць 6.470 экземпляраў розных газет і 873 журналы.

У адзінаццаці сельскіх советах праведзены тэлефоны, адкрыты паштовыя агенцтвы.

У раёне развіваецца мясцовая прамысловасць. Дражджавы завод, якім раней уладаў капіталіст Стругач, павялічыў выпуск прадукцыі ў 10 разоў. Калі раней завод выраблялі 10—12 тон дрожджаў у месяц, то зараз ён выпускае 100—105 тон у месяц. План выпуску дрожджаў за лістапад месяц выканан на 113 проц. Замест 27 рабочых, якія працавалі раней па 16—18 гадзін у суткі, зараз на прадпрыемстве працуе 116 рабочых. Работа праходзіць пазменна. Усе асноўныя працэсы механізаваны. На заводзе разгорнута сацыялістычнае спаборніцтва. Сярод рабочых выраслі выдатныя стаханаўцы, якія ў два-тры разы перавыконваюць свае нормы выпрацоўкі. Рабочыя беражна і па-гаспадарску адносяцца да сацыялістычнага абсталявання, эканомна скарыстоўваюць сыравіну. Заслужанай любоўю і павагай карыстаецца на заводзе стаханаўка ўпаковачнага цэха, кандыдат у дэпутаты раённага совета тав. Александровіч Міра Амуратаўна, якая штодзённа выконвае сваю норму выпрацоўкі на 150—160 проц. На 125 і больш процантаў выконваюць свае нормы тт. Янкоўскі і Гіруць — кандыдаты ў дэпутаты горсовета.

Так лад кіраўніцтвам вялікай партыі Леніна—Сталіна працоўныя раёна будуюць новае, шчаслівае жыццё.

А. БЯЗМЕН.

ГАЛАСАВАЦЬ БУДУ ПЕРШЫМ

Мне 70 год. Многа гора перажыў я на сваім вяку. Злзекваўся нада мной польскі пан, жандар. Бясконцыя падаткі і штрафы ўпчэнт разбурылі гаспадарку. Запомніўся мне дзень апошніх выбараў у гмінную раду, калі паліцыя бізунамі гнала нас галасаваць. А за каго прымушалі галасаваць? За багацеяў, якія смакталі нашу кроў.

Верасеньскія дні 1939 года прынеслі нам новае, светлае жыццё. Над намі заззялі праменні Сталінскай Канстытуцыі. Яны сагрэлі нашы сялянскія хаты.

Выбары ў органы совецкай улады сталі святам для працоўных. Ад маёй хаты выбарчы ўчастак знаходзіцца на адлегласці 5 кілометраў. Але таксама, як і ў часе выбараў у Вярхоўныя Советы СССР і БССР, я першым прыду на ўчастак і радасцю апушчу ў выбарчую урну бюлетэні з імёнамі нашых народных кандыдатаў.

Выбаршчык Гарадзькоўскага сельсовета Валожынскага раёна Васіль ВАЛКОВІЧ.

УСЕ НА ВЫБАРЫ!

ГАЛАСУЙЦЕ ЗА КАНДЫДАТАЎ СТАЛІНСКАГА БЛОКА КОМУНІСТАЎ І БЕСПАРТЫЙНЫХ!

* * *

Шчаслівае жыццё

Дні падрыхтоўкі да выбараў у мясцовыя советы працоўныя заходніх абласцей БССР з гордасцю адзначылі новымі поспехамі. Яны відаць усюды—на фабрыках і заводах, ва ўстановах і школах, у навучальных установах і ў самых далёкіх вёсках. Совецкая ўлада дала мільёнам у мінулым прыгнечаных людзей магчымасць жыць, працаваць, вучыцца, радавацца.

Карэспандэнт «Звязды» звярнуўся да раду рабочых і служачых Гродненскай дзяржаўнай табачнай фабрыкі з запытаннем, што новага і цікавага адбылося ў іх асабістым жыцці пасля ўстанаўлення совецкай улады ў Заходняй Беларусі. Ніжэй прыводзяцца асобныя адказы. Яны ярка паказваюць, якім радасным, шчаслівым і змястоўным стала жыццё працоўных, вызваленых ад ярма польскіх памешчыкаў і капіталістаў.

В. С. ПАДДУБІК

начальнік упаковачнага цэха

...овага ў маім жыцці за год совецкай ...ы адбылося вельмі многа. Але галоў...на і асноўнае — гэта тое, што я пра...цу на сябе, на сваю краіну. Пры ўла...дзе польскіх паноў беспрацоўе праследва...ла яне ўсюды. Як беларусу, мне ў кра...іне месца не было. Заўсёды маім лёсам, як многіх рабочых капіталістычных кра...ін, было беспрацоўе або турма. Каля 10 год я сядзеў у турмах панскай Польшчы, ...перарывах балэяўся па гораду ў ...ках заработку.

...боту мне дала совецкая ўлада. Ужо ...ол гола працую на Гродненскай та...чай фабрыцы. Спачатку быў брыгадзі...ам, цяпер з'яўляюся начальнікам упако...вага цэха. Такі быстры рост мне-б ...нулым і сніцца не мог.

...ё жыццё стала радасным. Я зараб...ю 600 рублёў у месяц, мне не трэба ...ніцца аб заўтрашнім дні. За ўсе мае ...оды жыцця я толькі пры совецкай ...е алчуў аб сабе велізарныя клопаты. ...просты прыклад. Я раней і марыць ...ог аб лячэнні. Совецкая ўлада дала ...магчымасць лячыцца. Паўтара месяца ...вёў за дзяржаўны кошт на адным з ...ых курортаў Саюза—у Ліваадзіі.

...налыходзячых выбарах мы ўсёй гу...дзем галасаваць за кандыдатаў бло...омуністаў і беспартыйных за наша ...чае, за партыю Леніна—Сталіна, якая ...ыла нас на светлую дарогу.

М. І. ГАРБАРСКАЯ

работніца склада

...мінулым мне вельмі цяжка і балю...спамінаць. Яно было бязрадасным, ні ...о светлага дня я не бачыла. Ніякія ...ры знайсці работу не дапамагалі. У ...ках кавалка хлеба я пераносіла шмат ...заў і пакут.

...праўднае жыццё пачалося ў мяне ...і з устанаўленнем совецкай улады. ...кая ўлада прытуліла мяне, як родная ...маці, сагрэла. Гэта такая радасць, ...цяжка выразіць. Скажу толькі: ...й Сталіну, совецкай уладзе за ра...асць, шчаслівае жыццё!

Б. М. САДОЎСКІ

рабочы ўпаковачнага цэха

...нацыянальнасці я паляк, але пры ...польскіх памешчыкаў і капіталі...ў мяне не любілі за тое, што праўду ...ы гаварыў, і яшчэ за тое, што ў ...ых высмейваў «парадкі» ў магіст...е.

...совецкай краіне я бачу сапраўд...рацтва ўсіх народаў. Палякі, белару...сы, украінцы, яўрэі — усе карыстаюцца ад...навымі правамі совецкіх грамадзян.

...табачнай фабрыцы са мною рэзам ...аюць мая жонка Екацярына і сын ...ыр. Двое маіх дзяцей вучацца бясплат...е школе. Раней гэта ўсё немагчыма.

...зень выбараў я, мая жонка і сын ...даім свае галасы за вылучаных наро...ндыдатаў, будзем галасаваць за на...праўдную радзіму — СССР.

А. І. КЛОЎСКІ

начальнік скрыначнага цэха

...ол я сядзеў у турме. Вызваліўся з ...ам Чырвонай Арміі — стаў сва...м чалавекам. Гэта — першая падзея ...ім жыцці, якая адбылася з устанаў...м совецкай улады.

...тая падзея — я нарэшце атрымаў ...магчымасць працаваць на прадпрыемстве. ...афесіі я столяр, і мяне вылучы...ні пасаду начальніка скрыначнага цэ...ох выконвае свой план.

...цер я працую намеснікам старшыні ...ацовай выбарчай камісіі.



Будынак, дзе змяшчаецца Совецкі выбарчы ...ўчастак № 6 г. Брэста па выбарах у мясцо...вы советы дэпутатаў працоўных. Фота В. Л...ейка. (Фотахроніка БЕЛТА).

Выбаршчыкі 3-га выбарчага ўчастка гор. Відзікі ў агітпункце. Злева направа: М. Зайцава, Е. Качэргіна, В. Капцюх, А. Альфер, Н. Балашко.

Фото І. Казловіча.

І. А. СОБАЛЬ

токар-стаханавец механічнага цэха

Рабочаму, ды яшчэ яўрэю, у былой панскай Польшчы прыходзілася цярпець многа здзекаў. Я — кваліфікаваны токар-універсал, але мне не давалі магчымасці працаваць па спецыяльнасці. 7 год да прыходу Чырвонай Арміі я быў чорнарабочым.

У першыя-ж дні прыходу ў Гродна Чырвонай Арміі я стаў працаваць па спецыяльнасці. Хацелася ўсё зрабіць, каб адплачваць за наша вызваленне. Перад сваёй пагібеллю паны зламалі на фабрыцы машыны. Мы, слесары і токары, дзень і ноч працавалі і быстра правялі мантажныя работы, адналілі станкі. Самі рабочыя былі ініцыятарамі арганізацыі вытворчасці папяросна-набіўных машын. Наш механічны цэх ужо зрабіў 14 такіх машын, цяпер мы атрымалі заданне зрабіць яшчэ 105. У асваенні вытворчасці папяросна-набіўных машын ёсць доля і маёй працы. Сваю норму выконваю на 250—300 проц. І вось яна мая гордасць і радасць — я стаў стаханаўцам, перадавым совецкім рабочым. Усюды мне пачот і павага. Летам мяне прэміравалі путёўкай у санаторый Друскенікі. Дома ў мяне весялей стала — 11-гадовая дачка Хана вучыцца ў музыкальнай школе.

Мне аказалі вялікае давер'е — вылучылі старшынёй 165 акруговай выбарчай камісіі па выбарах у гарадскі совет.

Е. П. ШЫЗІЛЬКА

стаханаўка ўпаковачнага цэха

У 14-гадовым узросце я самастойна пачала здабываць сабе сродкі да жыцця. Была чорнарабочай на лесапільным заводзе, прыбіральшчыцай на парахозе. Дачка беларуса, селяніна-бедняка ў панскай Польшчы і марыць не магла аб большым.

А цяпер, пры совецкай уладзе, мяне вылучылі кандыдатам у дэпутаты Гродненскага гарадскога совета, зрабілі роўнай з усімі, накіравалі па выдатнаму сонечнаму шляху.

Я паступіла ва ўпаковачны цэх табачнай фабрыкі. Працавала добра, перавыконвала план, і мяне накіравалі вучыцца ў Ленінград на двухмесячныя курсы па павышэнню кваліфікацыі. Я хадзіла па цэхах ленінградскай фабрыкі імені Урыцкага і сэрца маё хвалявалася ад радасці, што да майго кашмарнага мінулага не будзе ўжо ніколі звароту. І я стану такой-жа шчаслівай работніцай, як усе гэтыя жанчыны, што стаяць ля станкоў. Яшчэ і цяпер перад маімі вачыма стаіць цудоўны Ленінград.

У бліжэйшыя дні ў нас на фабрыцы будзе пушчан папяросна-набіўны цэх. Я бяру абавязацельства працаваць на трох станках, а з цягам часу перайду і на 4 станкі.

НАРАДЖЭННЕ ДРУЖБЫ

Яшчэ не так даўно Ядвіня Владзіслаўна, маці Анеты, і слухаць не хацела пра нейкае каханне дачкі з прыехаўшым настаўнікам. Праўда, чалавек ён як чалавек: ветлівы, просты, далікатнага абыходжання з людзьмі. Але адно прозвішча што гаворыць: Левінсон Міхаіл! Кожны раз, калі гутарка заходзіла аб настаўніку, яна пазяхала, нібы гэта яе не цікавіць, нібы яна і слухаць аб ім не жадае. У сэрцы-ж варушылася нешта трывожнае, няяснае, незразумелае. Не тое, што яна ненавідзела настаўніка: ён з віду нават і спадабаўся. Але як можна нарушаць старыя традыцыі? Як можна яўрэя мець зяцем? Як-жа ёй, вернай каталічцы, глядзець у вочы святому ойцу Станіславічу? А што скажуць суседзі? Ужо шушукаюцца. Праўду сказаць, некаторыя зайздросцяць: да іх вось дачок не сватаюцца. А хіба яна тут вінавата? Але закон... Людзі... Касцёл...

Найшлі думкі супярэчлівыя, непрымірымыя. І Ядвіня Владзіслаўна, маці Анеты, у такія хвіліны старалася пераканаць дачку, даказаць ёй яе памылку.

Анета спакойна ўсё выслухоўвала. Ясна было адно: Міхаіл Левінсон — чалавек разумны, ветлівы, з добрым сэрцам і кахае яе чыстай, шчырай і праўдзівай душой. І яна, Анета, таксама пакахала яго горача, пакахала сэрцам. І сіла кахання брала верх над усім. На мацярынскія довады Анета адказвала проста, але шчыра, пераканаўча:

— Сэрцу не загадаеш, мама. Прыпомні сваю маладосць, каханне...

Гэтымі словамі Анета заўсёды крапала сэрца мацеры — у ёй прабуджаліся думы, пачуцці, успаміны.

Жыць было нялёгка. Бацька — вясковы фельчар — памёр, калі ёй — Ядвіні—было 10 год. Маці вышывала, пляла карункі і зяк-так зарабляла на кавалак хлеба. Яна стараласа вучыць Ядвіню на настаўніцу, толькі вучыць так і не ўдалося. Маці часта стала хварэць. А тут, як на тое ліха, падвярнуліся сваты. Было гэта на каляды. Зімовым вечарам у суботу на двор прыехала фурманка. Зазвінелі шаргункі, заіржаў стаенник. Сватацца прыехаў шляхціч Замольскі з фальварка Дуброўскага. Ядвіня ненавідзела гэтага чалавека. На фэсце або на вечарынцы кожны раз ён намагаўся танцаваць з Ядвіняй, і ёй станавілася прыкра ад яго расказаў пра свіней, жарабцоў, пра жарэбных кабыл.

Ядвіня не слухала яго, старалася не глядзець у яго халодныя вочы, у абрузглы ад гарэлкі твар. А тут раптам гэты агідны чалавек сватаецца. Ядвіня павінна быць яго жонкай. Не... Няхай будзе што будзе...

Сваты так і паехалі, не дабіўшыся толку. Маці Ядвіні—Юзэфа—была вельмі абурана. Прываліла гэтажае шчасце ў двор і не маглі ўтрымаць!

І чаго толькі не гаварыла старая Юзэфа. А Ядвіня ў адно слова:

— Не пайду, сэрцу не міл. Мая душа не ляжыць да яго.

Так і не выйшла Ядвіня за нялюбага. На сёмуху пасватаўся да яе хлапец гэтай-жа вёскі Вінцусь. Чалавек ён бедны, але мілы, па сэрцу прышоўся. І Ядвіня дала згоду выйсці за яго.

Усё гэта Ядвіня — маці Анеты — успамінала, калі дачка гаварыла пра волю сэрца, пра яго пачуцці. І праз некаторы час Ядвіня Владзіслаўна сышла са сваіх, здавалася, непахісных пазіцый. І наогул у ёй адбыліся вялікія перамены. Пры кожным зручным выпадку яна старалася пагутарыць аб Левінсоне.

Аднойчы за вячэраю Анета рашыла думкі, вынашаныя ў сэрцы, выказаць уголас.

— Скажу табе навіну, маці.

— Скажы.

— Мы рашылі з Мішам запісацца.

— Як-жа гэта рашылі? А мяне запыталі? — наўмысля сурова загаварыла маці.

— Ты-ж усёроўна не благаславіш. Ты-ж супроць.

— Вось выдумала! Супроць... Уся-ж вёска яго хваліць, паважае, такі чадны, разумны.

— Я так і ведала. Ты стала зусім іншая. Ну як-бы ўсё старое вынялі з тваёй душы.

— Праўду пазнала. Многа брахалі, праклятыя, пра комуністаў, ды пра іх... Хоць-бы пра яўрэяў.

Ядвіня Владзіслаўна крыху падумала і шчыра прызналася.

— Да таго-ж веры не хацелася ламаць. Што ксёндз скажа? Ды мала чаго ў галаву лезла. Добры чалавек, твой Міша, ды і людзі добра аб ім кажуць. А ксёндз... ксёндз брэша.

...Было за поўнач. У гэту ноч і дачка і маці лажыліся спаць з чыстымі і яснымі думамі. І на сэрцы ў іх было таксама светла, як гэтай зорнай снежаньскай ноччу.

А. БЯЛЕВІЧ.

г. Кобрын.

* * *

Наша маладосць

(Расказы маладых рабочых)

I

Як толькі мне споўнілася 12 год, мой бацька сказаў:

— Ну, Лёня, пара на заработкі, пара.

Я бачыла, як ён засумаваў. Бацька ў нас добры і ён вельмі хацеў, каб я і ўсе яго дзеці вучыліся. Але для нас, дзяцей селяніна-бедняка, гэта было нязбытнай марай. У нас у сям'і 7 дзяцей. І ўсе мы рана пачалі свой працоўны шлях.

Маленькай дзяўчынкай пайшла я ў батрачкі да кулакоў нашай-жа вёскі Споркаўшчына, Лідскага раёна. Пасвіла жывёлу, зімой працавала на маланьбе, летам ад цямна да цямна — на ўборцы збожжа. Працаваць прыходзілася па 18 гадзін у дзень, а атрымліваць па 30 грошаў.

Праходзілі самыя юныя, самыя залатыя годы, а прасвету ў жыцці і не відаць было. Задумала я ісці ў горад, у надзеі, што можа там будзе лепш. Прышла ў Ліду і цэлы тыдзень хадзіла па фабрыках і заводах, прасілася на любую работу. Адказ усюды быў адзін: работы няма.

Па гораду тады хадзілі тысячы беспрацоўных людзей. Што рабіць было? Прыйшлося пайсці ў прыслугі. За 10 злотых у месяц трэба было рабіць усё, што табе загадае пані: няньчыць дзяцей, мыць, чысціць, угаджаць усім і ўніжацца.

Я шукала выхаду. Паступіла чорнарабочай на фабрыку «Ардаль», але жыццё не палепшылася. Здавалася, на векі я асуджана на пакуты.

Але на 20-м годзе ўзышло і для мяне сонца. Настала вясна майго жыцця, і мне адкрыліся ўсе шляхі да шчасця. Мая вясна пачалася ў верасні 1939 года. У мяне, як і ў кожнай маладой дзяўчыны, было адно імкненне: добрай, самаадданай работай падзякаваць вялікаму Сталіну за тое, што нам вернута залатая юнасць.

Я стала працаваць на канвееры ў зборачным цэху. Мы амаль не заўважалі, як хутка праляталі восем гадзін. На дошцы пачота паявілася і маё прозвішча. Стаханаўкай стала. У пачатку гэтага года ўступіла ў комсамол. Нядаўна ў нашым цэху арганізавалася комсамольска-маладзёжная брыгада. 1100 пар калош за змену выпускае наша брыгада замест 640 па норме. Усё маё жыццё стала змястоўным. Рашыла ў што-б та ні стала атрымаць сярэднюю асвету. Наведваю вячэрнюю школу. У свабодны час прымаю ўдзел у фабрычным драматычным гуртку. Я—член рэдкалегіі насценнай газеты.

І вось яшчэ адна вялікая, нечаканая для мяне радасць. Я — кандыдат у дэпутаты Лідскага горсовета.

Мне 21 год. Маладосць мая толькі пачынаецца. Яна сагрэта мацярынскай любоўю вялікай Совецкай краіны.

Сёння я буду галасаваць за сваю шчаслівую маладосць.

Леаніда ПУЙДАК,
стаханаўка лідскай гумавай і скурабутковай фабрыкі «Ардаль».

II

Біяграфія мая тыпічна для маладых людзей, юнасць якіх прайшла ў былой панскай Польшчы. Сям'я наша, якая складалася з 10 душ, не магла пражыць на тое, што даваў неўраджайны кавалачак зямлі, і дзеці з маленства ўходзілі шукаць сабе месца ў жыцці.

Але месца мы ніколі не знаходзілі. Наш лёс быў, у лепшым выпадку, адзін — цяжкая праца і беднае жыццё.

Усяго не раскажаш, бо ў свае маладыя годы я ўжо многае пазнаў. У сямігадовым узросце працаваў пастухом у кулакоў, затым паступіў падсобным рабочым да каваля. Летам хадзіў на Нёман на сплаўныя работы, на пагрузку дроў.

Аднойчы я задумаў паступіць на работу на чыгунку. Мяне прынялі на будаўніцтва пуці. Не паспеў папрацаваць і поўдня, як мяне зволілі. Я стаў пытаць, у чым справа.

— Беларус, комуніст,—было адказам.

Справа ў тым, што ў той час мой старшы брат Іван быў арыштаван за рэволюцыйную дзейнасць.

Ішлі годы, безвыходныя і нічога не абяцаючыя. Зноў працаваў на сплаве. Канчалася работа — гаспадар звальняў. Каля двух год быў зусім беспрацоўным. Заўсёды ў самыя цяжкія мінуты я ўспамінаў словы брата:

— Не бядуй, будзе добра. Доўга панам не ўладарыць над намі.

Совецкая ўлада дала і мне магчымасць знайсці сваё месца ў жыцці. Ажыццявілася мая мара. Я стаў слесарам. Мяне прынялі на работу на фабрыку «Ардаль». Больш мне не трэба баяцца, што не будзе работы, што мяне выкінуць. Я ведаю, што ўсё залежыць ад маёй чэснай, адданай работы на сваім участку.

Хочацца яшчэ і яшчэ раз падзякаваць вялікаму Сталіну, які зрабіў нас свабоднымі і шчаслівымі.

За шчасце быць совецкім грамадзянінам я буду сёння галасаваць.

Павел КУДАШ,
слесар-інструментальшчык лідскай гумавай і скурабутковай фабрыкі «Ардаль».

III

Сёння ў маім жыцці самы радасны, шчаслівы дзень. Першы раз у жыцці я, роўнапраўная грамадзянка СССР, пайду да выбарчай урны, каб аддаць свой голас за дастойных людзей нашай радзімы — кандыдатаў у дэпутаты мясцовых советаў.

Мне 18 год. Я працую, вучуся. Як агітатар, я сумесна з выбаршчыкамі вывучала Сталінскую Канстытуцыю, выбарчы закон, добра ведаю сваіх кандыдатаў.

Яшчэ зусім нядаўна, якіх-небудзь 15 месяцаў таму назад, я была забітай, бяспраўнай. Мне было 14 год, калі я пакінула сваю родную хату, галодную сям'ю і пайшла з клунаначкам у руках у горад шукаць шчасця. З вялікімі цяжкасцямі ў Вільне мне ўдалося ўстроіцца прадаўшчыцай марожанага. Але хутка зноў апынулася без работы. А з дому атрымлівала невясёлыя пісьмы аб тым, што сям'я паранейшаму сядзіць без хлеба.

Пасля доўгіх вандраванняў, нарэшце, устроілася служанкай у доме фабрыканта. Тут мне прышлося цярпець многа зняваг. Так праходзілі дні. Такім напэўна было-б усё мае жыццё.

Але мінулае знікла назаўсёды. Жыццё маё, як і ўсіх працоўных краіны Советаў, азарона праменнямі Сталінскай Канстытуцыі. Я стала комсамолкай, паспяхова працую над павышэннем сваіх ведаў.

Мне ў дзень выбараў хочацца ад усяго сэрца, ад усёй душы сказаць мудраму правадыру, настаўніку — таварышу Сталіну вялікае дзякуй за шчаслівае, радаснае жыццё.

А. П. КАЧАН,
выбаршчыца гарадскога пасёлка Куранец, Вілейскай абласці.

IV

Мне 22 годы. Жыццё маё толькі пачынаецца. І я рад, што маладосць мая цяпер праходзіць у совецкай краіне. Ад мінулага ў памяці асталася толькі турэмная камера.

Зараз я поўны летуценняў. Я хачу стаць настаўнікам гісторыі. Я ўпэўнен, што гэтага дабіюся, бо я — совецкі грамадзянін.

Самая цікавая падзея ў маім жыцці за год совецкай улады — гэта тое, што я паступіў у комсамол. У дзень выбараў я буду галасаваць за шчаслівае юнацтва.

А. І. ШЭНАУТ,
каменшчык будаўнічай брыгады гродненскай табачнай фабрыкі.

На 12-й тэкстыльнай фабрыцы г. Беластока. Майстар ткацкага цэха А. Трыбаш (справа) правярае якасць пражы двухстаночніка-ткача Г. Іоэ — удзельніка соцспаборніцтва ў чэсць выбараў, выконваючы норму на 125 проц.

Фото А. Сапіра. (Фотахроніка БЕЛТА).

Госці

У сям'і калгасніка Аляксандра Кажура было вялікае свята. Упершыню ў жыцці ён, былы батрак графа Тышкевіча, рыхтаваўся ў сваёй кватэры, за багатым сталом прыняць гасцей, каб разам з імі адсвяткаваць XXIII гадавіну Вялікага Кастрычніка.

Кватэра напоўнілася прыемнымі пахамі толькі што вышчанага пірага, смажанага мяса і розных смачных блюд. Завіхаючыся каля печы, непакоілася гаспадыня:

— А ці многа прыйдзе да нас гасцей?

— Прыдуць, як табе гаварыў. А колькі — не ведаю.

І госці прышлі. Да іх прыходу ў суседзяў пазычылі чаркі, талеркі, лыжкі, відэльцы. Усё гэта зараз было акуратна раскладзена і расстаўлена на стале вакол пышных, румяных пірагоў, квашанай капусты, бутэлек віна і гарэлкі.

Гасцей сабралося многа. Прышлі калгаснікі — конюхі Філіп Лешч, Васілій Міхайлоўскі, сусед па дому Аляксандр Сушко, старшыня арцелі Нікалай Завадскі. Прышлі сяляне-аднаасобнікі з суседніх вёсак Драні і Брускаўшчына Нікалай Раманоўскі, Владысь Карней, Стась Цярэшка, Іван Бажко і многа іншых знаёмых.

— Багата жывеш, Аляксандр, — прывітаўшыся, звярнуўся Нікалай Раманоўскі да гаспадара. — Дазволь цябе запытаць: хто раней жыў у гэтай кватэры?

— Вядома хто — упраўляючы графскім маёнткам.

— Так, не дрэнная кватэрка. — І Нікалай зазірнуў у сесуднія пакоі.

— А гэта чаму ў цябе столькі зярна тут насыпана?

— Бачыш, гаспадаром я нядаўна стаў. Свірна яшчэ не маю, у ім і патрэбы ў мінулым не было. А зараз толькі адной пшаніцы авансам на працадні больш 40 пудоў атрымаў. Вось прыходзіцца частку кватэры заняць зярном.

— Дык ты яшчэ, значыцца, атрымаеш?

— Атрымаю.

— А ці добрая пшанічка?

— Добрая.

Нікалай не вытрымаў, узяў у жменю залатое зерне пшаніцы, асцярожна ўсыпаўшы ў рот, разжоўваў.

— Што гасцей зернем частуеш? — умяшалася гаспадыня. — Прасі да стала. Няхай лепш пірага адведаюць.

Госці чынна расселіся за стол. І пакуль гаспадар наліваў па першай чарцы віна, яны перакідваліся жартамі, кожны з іх цікавіўся, з чаго тут пачаць закусваць.

— Са святам, дарагія таварышы, — падняўшы чарку, павіншаваў прысутных гаспадар.

— Са шчаслівым калгасным жыццём,— дапоўніў яго старшыня арцелі.

Нікалай пераглянуўся з суседзямі-аднаасобнікамі і, не сказаўшы ні слова, асушыў чарку да дна. І толькі, калі застукалі талеркі і ўсе апетытна пачалі закусваць, ён сказаў:

— Вось ты, Нікалай Маркавіч, гаворыш, — звярнуўся ён да старшыні арцелі, — са шчаслівым калгасным жыццём. Гэта як-быццам нам не падыходзіць. Аднаасобнікі-ж мы яшчэ.

— Не ўсё жыццё вы будзеце аднаасобнікамі, — адказаў старшыня. — Пажывеце, прыглядзецеся да нашага калгаснага жыцця, і я больш чым упэўнен, што пойдзеце ў калгас.

— Гэта вядома, — прамовіў Владысь Карней. — Па праўдзе кажучы, мы ўжо і так прыглядзеліся да вашага жыцця і бачым, як угору вы ідзеце.

Слова за словам гутарка завязалася вакол асноўнага, дзеля чаго сюды, можа быць, і прышлі сяляне-аднаасобнікі. Перш за ўсё, проста цікавіліся, колькі прадуктаў атрымлівае калгаснік. І Аляксандр Кажура па прыкладзе сваёй сям'і расказаў гасцям, як былая батрацкая сям'я, якая раней была рада кавалку чорнага хлеба, прышла да багатага жыцця.

— Вы вось падлічыце. Разам з жонкай за гэты год мы выпрацавалі 600 працадзён. На кожны працадзень у нашым калгасе мы атрымліваем 5 кілограмаў зярна, 15 кілограмаў бульбы, 9 кілограмаў кармоў для жывёлы. Грашыма, праўда, малавата, толькі па 50 капеек. Але хлеба для маёй сям'і па два годы хопіць, і пірог за стала не будзе сходзіць. А навошта мне гэтыя запасы? З жонкай мы рашылі лепш купіць добрую карову і швейную машыну.

— Сям'я Аляксандра Кажуры — гэта сярэдняя ў нашым калгасе сям'я — заявіў старшыня арцелі.—Возьміце к прыкладу такія сем'і, як Аляксандра Зянько, Іосіфа Рачыцкага. Яны выпрацавалі каля тысячы працадзён.

— Я са сваёй гаспадаркі за два годы не атрымаў такога даходу, як сям'я калгасніка Кажуры, — адкрыта прызнаецца Нікалай Раманоўскі, — а гаспадарка не бядняцкая, можна прама сказаць — серадняцкая.

— Справа не ў гэтым, — заўважыў Іван Бажко. — Многа няпраўды нам, як я бачу, гаварылі аб калгасах. Таму і страшна пеяк было. Зараз мы бачым зусім іншае.

Госці асабліва цікавіліся расказам старшыні арцелі Нікалая Завадскага аб калгасе, аб Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы, на якой яму гэтым летам удалося пабываць.

— Асабліва мяне па выстаўцы зацікавіў павільён торфу, — гаворыць ён. — Я нават не ўяўляў сабе, што торф з'яўляецца такім багаццем. А колькі ў нас гэтага торфу ляжала никрапутым!

Пераймаючы вопыт выстаўкі, гэтым летам мы арганізавалі ў калгасе загатоўку торфу на ўгнаенне. Здабылі звыш 800 тон. Зараз торф будзе вывозіцца на поле і кампаставацца разам з гноем. Апрача таго гэтай восенню пад яравыя культуры ўзаралі першыя 13 гектараў тарфянікаў.

Расказваючы аб наступіўшым новым калгасным жыцці, старшыня арцелі не забыў упамянуць аб вырасшых за гэты кароткі час людзях. Толькі адных трактарыстаў у калгасе падрыхтавана 5 чалавек. Гэта Стась Керсноўскі, Нікалай Сысун, Марыя Кісель, Сігізмунд Рачыцкі, Пётр Анкуда. На агранома вучыцца паслалі Владыка Рачыцкага, у школу ФЗА—Франца Анкуда і Івана Сушко.

— Гэтай восенню ў нашым калгасе арганізаван дзяржаўны сортавыпрабавальны ўчастак, — пралаўжаў расказваць Нікалай Завадскі. — Калгаснікі зараз узяліся разам з аграномам за вывучэнне агратэхнікі, каб дабіцца яшчэ больш высокіх ураджаяў, значыць яшчэ больш заможнага, культурнага жыцця.

Госці разыходзіліся позна вечарам. Многія не пайшлі адразу дамоў. Па дарозе яны яшчэ заглянулі ў некалькі кватэр калгаснікаў, цікавіліся іх жыццём-быццём. Але ўсюды ім гаварылі аб тым, што бачылі яны сёння ў былой батрацкай сям'і Аляксандра Кажуры.

***

Прайшло некалькі дзён. У памяшканне праўлення калгаса зайшоў аднаасобнік вёскі Брускоўшчына Нікалай Раманоўскі, адклікаў у бок старшыню калгаса.

— Вось што, Нікалай Маркавіч, рашыў і я да вас у калгас падацца. Пакапаўшыся запазухай, ён дастаў акуратна складзены кавалачак паперы. Гэта была заява аб уступленні ў калгас. Нікалай Завадскі прачытаў яе голасна.

«Я, грамадзянін вёскі Брускоўшчына, Раманоўскі Нікалай Нікалаевіч, прашу праўленне прыняць мяне ў калгас імені 17 верасня. Я маю 10 гектараў зямлі, аднаго каня, двух кароў, адно цялё, трох авечак, трох свіней, добрую цялегу, вупраж, адзін плуг, адну барану. Абавязваюся працаваць чэсна, па-стаханаўску».

Нікалай Раманоўскі зараз з'яўляецца калгаснікам. Ён стрымаў сваё слова — працуе чэсна, старанна. Пасля яго ўступлення ў калгасную сям'ю прынята яшчэ 6 гаспадарак. Цяга аднаасобнікаў у арцель не аслабявае.

— Пад рознымі прадлогамі да нас усё часцей і часцей заглядаюць зараз аднаасобнікі, — заяўляе Нікалай Завадскі, кандыдат у дэпутаты Хожаўскага сельскага Совета дэпутатаў працоўных. (Маладзечанскі раён).—Гэта пакуль яшчэ госці, але мы ведаем, навошта яны заходзяць і чым цікавяцца. Таму і стараемся як мага падрабязней расказаць аб нашым калгасным жыцці.

Вось і зараз, ідучы па запарошанаму першым сняжком двару, ён звяртаецца да міма праходзячай жанчыны:

— Ну, Марыя, калі ў калгас?

— Вось выберам цябе ў дэпутаты, потым у калгас.

— Што ты доўга так збіраешся? Хопіць табе кулаку за каня адпрацоўваць. Тваё месца сярод нас.

— Ведаю,—на-ходу гаворыць сялянка-бяднячка Марыя Пагуда з вёскі Драні.— Толькі памятай, калі я пайду ў калгас, я табе жыцця не дам. Мне работа павінна быць кожны дзень. Я ўжо такая...

— Былі-б рукі і жаданне, а работа заўсёды знойдзецца, — гаворыць услед жанчыне старшыня. Ён ідзе міма шматлікіх гаспадарчых будынкаў. З адкрытага свірна даносіцца траскатня веялкі. Там ідзе ачыстка насення для пасеву.

Н. ВІШНЕЎСКІ.

Калгас імені 17 верасня,
Маладзечанскага раёна.

ЗА РУБЯЖОМ

Англа-германская вайна

Германскія паведамленні

БЕРЛІН, 14 снежня. (ТАСС). Вярхоўнае камандаванне германскай арміі паведамляе:

У ноч на 13 снежня германская авіяцыя падвергла інтэнсіўнай бамбардыроўцы прадпрыемствы цяжкай прамысловасці Шэфілда. Адзначаны шматлікія пажары і ўзрывы на заводах сталеліцейнай прамысловасці і на іншых ваенных прадпрыемствах горада.

Германская падводная лодка патапіла непрыяцельскія судны агульным водазмяшчэннем у 40.900 тон. Другая падводная лодка патапіла тры ўзброеныя гандлёвыя параходы агульным водазмяшчэннем у 15.800 тон.

Англійскія самалёты ўчора ноччу скінулі бомбы ў Паўночнай і Заходняй Германіі. Нанесены нязначныя страты дамам. 8 чалавек лёгка ранены.

Англійскія паведамленні

ЛОНДАН, 14 снежня. (ТАСС). Згодна сумеснага камюніке міністэрства авіяцыі і міністэрства ўнутраных спраў і ўнутранай безапаснасці, ні адзін з раёнаў Англіі ўчора не падвяргаўся бамбардыроўцы. Адзінкавы непрыяцельскі самалёт скінуў бомбу ў паўднёва-ўсходнім графстве Англіі.

Налёт англійскай авіяцыі на Германію

ЛОНДАН, 14 снежня. (ТАСС). Міністэрства авіяцыі паведамляе, што, не гледзячы на неспрыяючыя метэаралагічныя ўмовы, у ноч на 14 снежня англійскія самалёты падверглі бамбардыроўцы суднабудаўнічыя верфі ў Кіле і ваенныя аб'екты ў Брэмене, дзе ўзніклі вялікія пажары.

Бомбы былі скінуты таксама на докі і аэрадромы Галандыі. Апрача таго, самалёты берагавой абароны атакавалі базу падводных лодак у Бардо.

Вайна паміж Грэцыяй і Італіяй

АФІНЫ, 14 снежня. (ТАСС). Грэчаскае камандаванне паведамляе, што на розных участках фронта адбываюцца ажыўленыя дзеянні грэчаскіх войск з спрыяючымі вынікамі.

Паводле паведамлення міністэрства дзяржаўнай безапаснасці, учора авіяцыя праціўніка зрабіла абмежаваную колькасць налётаў на ўнутраныя раёны краіны. Бомбы былі скінуты на некаторыя астравы ў Іянічскім моры і ў раёне Салонік. Колькасць афяр нязначная.

НЬЮ-ЙОРК, 14 снежня. (ТАСС). Як паведамляе агенцтва Юнайтэд Прэс, англійская і грэчаская авіяцыя праяўляе значную актыўнасць, дэзарганізуючы адступаючыя італьянскія войскі ў раёне Хімара. У сектары Клісуры галоўныя сілы італьянцаў адступаюць да Валоны.

Каля Тэпелене адбываюцца жорсткія баі. Італьянцы аказваюць тут моцнае супраціўленне грэкам. Некаторыя пазіцыі некалькі раз пераходзілі з рук у рукі. З абодвух бакоў ёсць вялікія страты.

У выніку артылерыйскага абстрэлу Тэпелене ў горадзе ўзніклі пажары і налічваецца многа афяр сярод грамадзянскага насельніцтва. Грэчаскія войскі рухаюцца па дарозе Тэпелене—Валона, прабуючы абыйсці Тэпелене з паўночнага захада. У раёне гор К'ярыста грэкамі захвачана некалькі вёсак і вышынь. Каля Аргоска грэкамі захвачаны пункты Люарасі і Кесаракe. Грэкі ўзялі ў палон 5 італьянскіх афіцэраў, 300 салдат. Захвачана дзве палявыя гарматы і 8 кулямётаў. На фронт на поўнач ад Паградзеца італьянцы перакінулі па самалётах падмацаванні.

Ваенныя дзеянні ў Заходняй пустыні

ЛОНДАН, 14 снежня. (ТАСС). Агенцтва Рэйтэр паведамляе, што ў Заходняй пустыні англійскія і імперскія войскі прадаўжаюць наступленне. Англійскія аперацыі развіваюцца здавальняюча. Італьянскія дывізіі, якім удалося вырвацца з англійскага акружэння, адступаюць у напрамку да Лівіі.

У камюніке камандавання англійскіх паветраных сіл на Бліжнім Усходзе ўказваецца, што ўсю ноч 12 снежня і днём 13 снежня англійскія самалёты няспынна бамбардыравалі аэрадромы, скапленні войск і мотатранспарта праціўніка ў Лівіі. Асабліва жорсткай бамбардыроўцы падвергся Тобрук. У горадзе ўзнікла многа пажараў. У Эль-Эдэме поўнасцю разбураны ангары на аэрадроме. У часе налётаў на Бардыю знішчаны тры непрыяцельскія самалёты. Пры бамбардыроўцы Эль-Тміні адзін італьянскі самалёт збіт, другі моцна пашкоджан. Усяго больш 12 непрыяцельскіх аэрадромаў і пасадачных пляцовак атрымалі вялікія пашкоджанні. Самалётамі аўстралійскіх паветраных сіл знішчаны тры італьянскія самалёты. Тры англійскія самалёты не вярнуліся на сваю базу.

Англійская авіяцыя, гаворыцца далей у камюніке, прадпрыняла таксама цэлы рад налётаў на некаторыя пункты Італьянскай Усходняй Афрыкі. 11 снежня англійскія самалёты бамбардыравалі Явела (Абісінія), дзе знішчаны 3 італьянскія самалёты і 3 пашкоджаны.

НЬЮ-ЙОРК, 14 снежня. (ТАСС). Як перадае агенцтва Асошыэйтэд Прэс, англійскі марскі флот наблізіўся да ўзбярэжжа Лівіі і знаходзіцца ў поўмілі ад Бардыі.

Англійскія ваенныя караблі звыш гадзіны бамбардыравалі скапленні італьянскіх войск у раёне егіпецка-лівійскага ўзбярэжжа. Бамбардыроўцы падвергся ўвесь прыбярэжны раён ад Салума да Бардыі.

Лік палонных, захвачаных англічанамі, дасягае 30 тысяч, з якіх 14 тысяч было ўзята ў раёне Сідзі-Барані.

Заява англійскага пасла ў ЗША Латыяна

НЬЮ-ЙОРК, 12 снежня. (ТАСС). На з'ездзе кансерватыўнай фермерскай арганізацыі «Амерыкэн фарм бюро федэрэйшэн» у Балтыморы 11 снежня быў зачытан зварот англійскага пасла ў ЗША Латыяна, напісаны ім незадоўга да смерці, у якім ён заявіў, што перамога Англіі залежыць ад амерыканскай дапамогі ваенна-марскім флотам і фінансамі, **і заклікаў да сумеснага англа-амерыканскага сусветнага панавання пасля сканчэння вайны.**

Гаворачы аб тым, што Германія ўжо заваявала ўсю Еўропу, «за выключэннем Англіі і Расіі», Латыян заявіў, што толькі перамога Англіі можа перашкодзіць германскаму нападу на Амерыку.

«Калі Гітлер зможа нанесці паражэнне Англіі, ён і яго прыяцелі атрымаюць базу для заваявання сусветнага панавання. Германіі не ўдалося перамагчы Англію шляхам паветраных нападаў, і ў сучасны момант яна канцэнтрыруе сваю ўвагу на знішчэнні англійскіх ваенных караблёў, якія нясуць канвойную службу, імкнучыся прыпыніць снабжэнне Англіі прадуктамі харчавання, самалётамі і т. д.

Англія вымушана раскідваць свой ваенна-марскі флот на вялікай прасторы. Гэтая акалічнасць датычыць Злучаных Штатаў амаль у той-жа меры, як і Англіі, бо бяспаснасць ЗША залежыць ад таго, ці будзе Англія ў стане кантраляваць Атлантычны акіян таксама, як Злучаныя Штаты — Ціхі. Калі Англія будзе разбіта, Злучаным Штатам будзе пагражаць небяспека.

Германія аказвае даўленне на Японію, каб тая пашырыла вайну на Ціхі акіян. Таму абедзве нашы дзяржавы жыццёва зацікаўлены ў тым, каб напад на англійскія камунікацыі быў рашуча адбіт.

1941 год будзе годам вельмі сур'ёзных падзей. З дапамогай ЗША мы зможам атрымаць перамогу ў 1942 годзе. Без вашай дапамогі самалётамі, ваенным снаражэннем, суднамі і фінансамі мы не зможам забяспечыць гэту перамогу».

Латыян далей заяўляе, што амерыканцы павінны самі рашыць, у якой меры іх дапамога неабходна для ажыццяўлення перамогі Англіі.

«Пасля вайны, — указвае Латыян, — англійскі капіталізм знішчыць беспраноўе». Ён адкінуў заяву некаторых людзей, сцвярджаючых, што англійскай дэмакратыі прыходзіць канец. (Як відаць, Латыян меў на ўвазе нядаўнюю заяву амерыканскага пасла ў Англіі Кенедзі). Латыян абяцаў, што пасля вайны Англія не будзе ні фашысцкай, ні комуністычнай. Нарэшце, ён прапанаваў аформіць супрацоўніцтва паміж Злучанымі Штатамі і Англіяй.

«Нават калі мы атрымаем поўную перамогу, — указвае Латыян, — усёроўна немагчыма адрадзіць Лігу нацый. Мір і парадак будзе залежыць ад перавагі сілы. Гэту сілу маюць Злучаныя Штаты, Англія і некаторыя іншыя свабодныя дзяржавы, дзе існуюць ліберальна-дэмакратычныя законы. Моцны мір магчым толькі ў тым выпадку, калі Злучаныя Штаты і Англія будуць мець разам вялікую колькасць самалётаў, ваенных караблёў і будуць займаць лепшыя стратэгічныя пазіцыі, чым любы магчымы таталітарны праціўнік».

У заключэнне Латыян яшчэ раз падкрэсліў, што зыход вайны ў значнай ступені залежыць ад Злучаных Штатаў.

Ход лесазагатовак і вывазкі

ПА АБЛАСЦЯХ РЭСПУБЛІКІ І ТРЭСТАХ НАРКАМЛЕСА БССР НА 10 СНЕЖНЯ 1940 ГОДА (у тыс. кубаметраў)

Абласці	Загатоўкі: квартальны план	Загатоўкі: процант выканання	Вывазка: квартальны план	Вывазка: процант выканання
Баранавіцкая	640,0	26,8	425,0	16,8
Беластоцкая	459,0	21,3	242,0	20,2
Брэсцкая	290,0	22,7	180,0	20,2
Вілейская	450,0	30,2	280,0	23,7
Віцебская	246,0	48,1	144,4	14,9
Гомельская	65,0	90,0	44,5	54,8
Мінская	364,0	57,7	254,8	27,7
Магілеўская	342,0	68,4	250,0	23,6
Пінская	453,0	21,0	120,0	33,7
Палеская	391,0	51,2	240,3	46,3
УСЯГО	3700,0	37,5	2181,0	25,2

Трэсты наркамлеса	Загатоўкі: квартальны план	Загатоўкі: процант выканання	Вывазка: квартальны план	Вывазка: процант выканання
Мінлеспром	658,0	56,7	578,0	35,1
Моглеспром	350,0	68,4	410,0	41,8
Мозлеспром	393,0	50,8	358,0	53,0
Беластоклеспром	585,0	22,2	340,0	28,8
Новлеспром	614,0	26,3	410,0	17,6
Вілейлеспром	450,0	30,2	280,0	26,3
Палеслеспром	643,0	22,0	217,0	27,9
УСЯГО	3700,0	35,1	2600,0	33,8

УСЕСАЮЗНЫ АГЛЯД ТЭАТРАЛЬНАЙ САМАДЗЕЙНАСЦІ

Сёння пачынаецца першы тур усесаюзнага агляду тэатральнай самадзейнасці. Агляд ставіць задачы паляпшэння палітычнага, культурнага і мастацкага выхавання ўдзельнікаў самадзейных тэатральных калектываў.

У нашай рэспубліцы налічваецца каля двух тысяч тэатральных самадзейных калектываў. Ва ўсесаюзным аглядзе будуць удзельнічаць каля 1.000 калектываў.

Драмкалектыў гомельскага клуба чыгуначнікаў імені Леніна мае ў сваім рэпертуары такія п'есы, як «Сабака на сене» Лопе дэ Вега, «Любоў Яравая» К. Трэнёва, «Слава» В. Гусева. На аглядзе калектыў пакажа «Пагібель воўка» Э. Самуйлёнка.

Больш дваццаці год існуе драмкалектыў пры бабруйскім клубе промкааперацыі. Ён любоўна працуе над п'есамі Шолам-Алейхема. У яго актыве—«200.000», «Менахем Мендл» і іншыя. Да агляду падрыхтавана «Любоў Яравая» К. Трэнёва.

Драмкалектыў новабеліцкай запалкавай фабрыкі «Везувій» пакажа на аглядзе бяссмертную камедыю Гогаля «Рэвізор» З выключнай стараннасцю і любоўю рыхтаваў калектыў гэты спектакль.

Можна назваць і рад іншых калектываў, якія ставяць п'есы класікаў і совецкіх драматургаў. Гэта драмкалектывы віцебскага клуба медсанпрацы, ельскага Дома соцкультуры, чэрвеньскага Дома соцкультуры, магілеўскага аўтарэмзавода і т. д.

Упершыню ва ўсесаюзным аглядзе прымуць удзел тэатральныя самадзейныя калектывы заходніх абласцей нашай рэспублікі.

Лісьмо калектыву віцебскага станкабудаўнічага завода ім. Кірава ад Матыяса Ракошы

ВІЦЕБСК, 14 снежня. **(Па тэлефону).** Нядаўна рабочы калектыў віцебскага станкабудаўнічага завода імені Кірава звярнуўся з прывітальным лісьмом да прыбыўшага ў Совецкі Саюз былога венгерскага палітзняволенага, вядомага рэволюцыянера Матыяса Ракошы. 14 снежня на імя калектыва завода атрымана адказнае лісьмо:

«Дарагія таварышы!

Сардэчна дзякую за прывітанне. Можаце ўявіць сабе, з якім пачуццём я святкаваў у гэтым годзе знамянальную дату—7 лістапада. Пасля доўгіх год турмы я атрымаў магчымасць правесці дзень пабеданоснай соцыялістычнай рэволюцыі разам з працоўнымі чырвонай Масквы.

Цяпер я знаходжуся ў санаторыі і спадзяюся ў самым бліжэйшым будучым зноў прыступіць да работы.

З мопраўскім прывітаннем М. І. Ракошы».

ПА СЛЯДАХ ВЫСТУПЛЕННЯЎ «ЗВЯЗДЫ»

„На мінскай міжгародняй тэлефоннай станцыі"

Пад такім загалоўкам у газеце «Звязда» за 7 снежня быў змешчан артыкул, у якім указвалася на дрэнную работу міжгародняй тэлефоннай станцыі, адсутнасць працоўнай дысцыпліны, пагардлівыя адносіны да кліентаў і т. д.

Як паведаміў нам дырэктар станцыі т. Ракоўскі, артыкул абмяркоўваўся на сходзе работнікаў міжгародняй тэлефоннай станцыі. Сход прызнаў, што артыкул правільна адлюстроўвае меўшыя месца факты.

Намечаны мерапрыемствы па знішчэнню ўсіх недахопаў.

ТЭАТР

„АПТЫМІСТЫЧНАЯ ТРАГЕДЫЯ"

(Прэм'ера ў Польскім дзяржаўным тэатры БССР)

Пасля п'ес Шылера, Фрэдро, Запольскай Польскі дзяржаўны тэатр БССР паставіў п'есу «Аптымістычная трагедыя» Всевалада Вішнеўскага.

П'еса Вішнеўскага ўводзіць нас у эпоху грамадзянскай вайны, у эпоху найвялікшых бур, соцыяльных канфліктаў, ідэалагічных і асабістых зутычак, у час, насычаны найглыбейшым драматызмам. Сам у мінулым матрос, удзельнік грамадзянскай вайны, Вішнеўскі рысуе сцэну з жыцця ваеннага карабля, каманда якога, заражоная анархічнымі ідэямі, адчувае агіду да ўсякага парадку. Дробнабуржуазная распушчанасць, анархічная ідэалогія прыводзяць да зверскага замасуду над сваім ні ў чым не вінаватым таварышам, да расстрэлу палонніка — інваліда вайны, вяртаючагася на радзіму, якога вабіць рэволюцыя. Гэты гнайнік пагражае звесці рэволюцыю з правільнага шляху, прывесці яе да гібелі. Але вось у гэтае затхлае паветра фізічнага і маральнага разлажэння ўрываецца асвяжаючы струмень. На караблі паяўляецца жанчына-камісар, прысланая большэвіцкім Цэнтральным Камітэтам. Завязваецца вострая барацьба камісара за зварот матроскага калектыва да рэволюцыі, барацьба, якая канчаецца трагічнай гібеллю камісара на фронце ў той момант, калі матроскі калектыў, вырваны з анархічнага балота, гатоў аддаць радзіме і рэволюцыі сваю кроў, сваё жыццё.

На здымку: сцэна з 3-га акта. Артыстка І. М. Бароўская выконвае ролю камісара; у ролі Алексы артыст А. М. Шаляўскі.

Творчая лінія пастаноўшчыка А. Венгерка — рамантычная. Ён шукае ўзвышаных, моцных пачуццяў, складаных характараў, вострых драматычных сітуацый. Многае з гэтай галіны знайшло адлюстраванне ў рамантыцы «Аптымістычнай трагедыі».

Але драма мае недахопы. Негатыўныя тыпы паказаны тут з поўным размахам, варожыя элементы абрысаваны да самых прыкрых інтанацый, у той-жа час станоўчыя героі слабамоцныя, бледныя. Вялікім недахопам п'есы з'яўляецца тое, што аўтар не паказаў глыбокага ідэалагічнага перараджэння матросаў, іх прыход да пролетарскай свядомасці. На жаль, ні калектыў тэатра, ні рэжысёр не асмыслілі гэтай памылкі. У цэнтры спектакля вядучым героем аказаўся важак Сіплоў — чалавек ненармальнага псіхічнага складу, а станоўчыя героі цмяныя, непераканаўчыя.

Усё-ж, не гледзячы на гэтыя недахопы, спектакль палоніць гледача, захапляе яго. І гэта не толькі таму, што рэволюцыйная праўда пераканаўча але і таму, што рэжысёр стварыў жывыя, захапляючыя сцэны. Венгерка майстэрска падаў выражэнні і рухі, ігру толпаў і святла, ён паглыбіўся ў матроскія настроі і ўвасобіў героіку таго часу. Трагічная драма сплялася далікатнымі ніцямі, выцягнутымі роўнамерна і праўдзіва. Сцэна на ўзгорку, калі група матросаў разам з камісарам нападае ў палон, даведзена да ўзроўню гераічнага эпаса. Сцэна паяўлення на палубе камісара—напружаная да дрыжыкаў—адпрацавана да найдрабнейшых рысаў.

Выдатныя дэкарацыі мастака Владзіміра Сакольскага. Першая ўжо сцэна — высокі рэльеф, чырвоныя спягі на мачце карабля, акружанага бесспрасветным змрокам, — настройвае гледача рамантычна. Узгорак з палоннымі, фронт, канструкцыя карабля выклікаюць моцнае ўражанне.

Увесь цяжар спектакля нясуць на сваіх плячах тры артысты — А. Шаляўскі ў ролі Аляксея, С. Бутрым у ролі важака і І. Бароўская — у ролі камісара.

Шаляўскі — Аляксей — страсны ў сваіх парывах, рэльефны і рознабаковы яго голас, ён майстэрска пераходзіць ад дабрадушна-насмешлівага тону да бурнага акорда, ад цынізма — да прастадушна чуллівай лірыкі. Бароўская даказала, што яе жанр—не толькі жаноцтвенна-сентыментальныя, але і гераічныя вобразы. Яе цёплы голас, багатая міміка не пярэчаць стварэнню мужнай асобы — жанчыны-байца, але, наадварот, абагачаюць і ажыўляюць гэтую асобу. Аднак адчуваецца ў ігры Бароўскай некаторая бяззлітасць, перавыразнасць.

Важак у выкананні Бутрыма экспрэсіўна настроены, язвіцельны. Ён рухаецца на сцэне ў поўным усведамленні сваёго дэманічнага ўплыву на матросаў, задаволены сваёй напышлівасцю.

Чуллівы да слёз А. Венгерка ў ролі першага палоннага, які вяртаецца з фронта. Ён здолеў паказаць смутак інтэлігента на сваёй радзіме, па гуманістычных ідэалах рэволюцыі. У лірычна падкупаючых тонах і ў кароткай сцэне заваяваў глыбокую сімпатыю гледача Вапчаровіч, які стварыў вобраз прывабнага матроса-фіна Вайнонена, не сільнага ў пытаннях стратэгіі і тактыкі рэволюцыі, але адданага ёй да апошняй каплі крыві. Каларытна фігура Сіплова (артыст Сташэўск) — цынічнага труса, але каварнага правадыра матросаў.

«Аптымістычная трагедыя» — вельмі важны этап у творчасці Польскага дзяржаўнага тэатра БССР. Хоць у спектаклі тэатр не разгарнуў яшчэ сваіх вялікіх магчымасцей і дапусціў многа недахопаў і рэжысёрскіх памылак, але гэта недахопы мастацкага і ідэалагічнага росту тэатра. Няма сумнення, што ў далейшым яны будуць выпраўлены. Залогам гэтага з'яўляецца таленавітасць рэжысёра А. Венгерка і акторскага калектыва Польскага дзяржаўнага тэатра БССР.

Б. МАРК.

г. Беласток.

Музей у Лідзе

ЛІДА. У горадзе закончана абсталяванне гісторыка-краязнаўчага музея. У трох аддзелах — гістарычным, краязнаўчым і соцыялістычнага будаўніцтва — сабраны шматлікія мясцовыя матэрыялы.

Адкрыццё музея прыўрочваецца да новага года. (БЕЛТА).

Папраўка БЕЛТА

Першы абзац пастановы СНК БССР «Падрыхтоўка да размеркавання натуральных і грашовых даходаў у калгасах БССР», змешчанай у нашай газеце ад 14 снежня г. г., трэба чытаць:

Совет Народных Камісараў БССР прыняў пастанову аб падрыхтоўцы да размеркавання натуральных і грашовых даходаў і правядзенні гадавой справаздачнай кампаніі ў калгасах БССР.

ШАХМАТЫ

Зімовы конкурс рашэнняў

Задача № 4

Е. К. КУРАПАЦЕНКАЎ (Слаб... Магілеўскага раёна)



Белыя: Крa2, Фе2, Сс8 Kd7, п...

Чорныя: Крd5, пh2 (2).

Белыя пачынаюць і даюць мат у ... хады

Задача № 5

П. В. ВАСІЛЬЕЎ (Полацк)



Белыя: Крf8, Лa8, ...c6, пh6 (4)

Чорныя: Крh8, g8, пh7 (3)

Белыя пачынаюць і даюць мат у ... хады.

Сёння мы прапануем увазе чытачоў удзельнікаў конкурса дзве задачы-мініяцюры (мініятурай называецца кампазіцыя, у якой заданне афармлена не больш чым 7 ... рамі).

Уключэнне ў конкурс рашэнняў ... удзельнікаў дапускаецца да апублікаванага рашэння (конкурсныя задачы змяшчаюцца «Звяздзе» на нядзелях, пачынаючы з 1 ... стапада).

МІНСКІ АБЛАСНЫ ЧЭМПІЯНАТ

Сёння ў памяшканні шахматнага клуба школа, Комсамольская, 23) пачынаюцца ... ныя шахматны і шашачны чэмпіянаты ... скай абласці.

Удзел прымаюць пераможцы раённых матных і шашачных турніраў.

ПЕРШЫ ЖАНОЧЫ ТУРНІР

Першы абласны жаночы турнір Пінскай ... ласці праведзен Пінскім абласным шахматна-шашачным клубам.

У турніры прынялі ўдзел 7 жанчын — ... шых шахматыстак Пінска, Століна і Івацевіч.

Першае месца і званне чэмпіёнкі абласці ... заваявала т. Валькер-Прытулецкая з ... ным вынікам — 5½ ачкоў з 6 магчымых. Другое месца заваявала Глоўберман ... грэцяе — Новікава (4).

Па ініцыятыве Пінскага шахматнага клуба ... пачат матч па тэлеграфу паміж клубамі г. ... доў Пінска і Мазыра.

Паведамленне

Мінскі гарком КП(б)Б, горвыканком і Саюз совецкіх архітэктараў БССР скліча... юць агульнагарадскі сход архітэктараў ... месна з грамадскасцю горада па пытанні аб рэканструкцыі горада Мінска.

Сход адбудзецца 16 снежня, у 8 гадзін вечара, у памяшканні Дома партакту (вялікі зал).

Білеты атрымаць у РК КП(б)Б і Саюза совецкіх архітэктараў БССР (Совецкая, 3).

Адказны рэдактар Т. С. ГАРБУНОЎ.

Дзяржаўны ордэна Леніна Вялікі тэатр оперы і балета БССР
15 снежня
ЧЫО-ЧЫО-САН
Пачатак. у 8 г. 30 м. веч.
17 снежня
Спектакль для школьнікаў
У ПУШЧАХ ПАЛЕССЯ
Пачатак у 6 г. 30 мін. веч.
Бліжэйшая прэм'ера
ПІКАВАЯ ДАМА
Рыхтуецца да пастаноўкі балет
ДОН-КІХОТ

Першы Беларускі дзяржаўны ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга драматычны тэатр
15 снежня
ПЛАТОН КРЭЧЭТ
Пачатак у 8 г. веч.
Па калектыўных заяўках прадастаўляецца скідка

Дзяржаўны яўрэйскі тэатр БССР
15 снежня
ШВЕСТЭР
Пачатак у 8 г. 30 м. веч.

Кінотэатр «Чырвоная зорка» ПЯТЫ АКІЯН
Кінотэатр «Родина» «ВОЗВРАЩЕНИЕ»
Кінотэатр «Інтэрнацыянал» ЗАНГЕЗУР
Кінотэатр «Спартак» БЭЛА

У АДДЗЕЛ АБ'ЯЎ ЗВАНІЦЕ ПА ТЭЛ. 21-399

БЕЛАРУСКАЯ ДЗЯРЖАЎНАЯ ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ФІЛАРМОНІЯ
(Памяшканне клуба ім. Сталіна)
19 і 20 снежня
КАНЦЭРТЫ
Лаўрэат усесаюзнага і міжнароднага конкурсаў музыкантаў-выканаўцаў ордэнаносец
Ліза ГІЛЕЛЬС
(скрыпка)
Лаўрэат усесаюзнага і міжнароднага конкурсаў піяністаў ордэнаносец
Роза ТАМАРКІНА
Пачатак у 9 гадзін вечара.
Білеты ў касе клуба штодзённа з 2 г. дня да 9 г. веч. і ў касе напярэдняга продажу білетаў (рог Ленінскай і Совецкай, магазін санітыгіены).

3 1 па 10 студзеня 1941 года АДБУДЗЕЦЦА
СЕСІЯ ЗАВОЧНІКАЎ
МАГІЛЕЎСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ПЕДАГАГІЧНАГА ІНСТЫТУТА
Усім завочнікам трэба з'явіцца ў інстытут 31 снежня г. г.
Нез'явіўшыяся на сесію без уважлівых прычын будуць выключаны з ліку студэнтаў.
На падставе загада Наркомасветы БССР № 2547 ад 25 лістапада 1940 г. загадчыкі раёнаў і дырэктары школ павінны забяспечыць явку студэнтаў на сесію.
Завочнікам інстытут прадастаўляе кватэры.
ДЫРЭКЦЫЯ.

У МЭТАХ ЛЕПШАГА АБСЛУГОЎВАННЯ ПРАЦОЎНЫХ
ПРЫ ЦЭНТРАЛЬНАЙ РАБОЧАЙ ПОЛІКЛІНІЦЫ
АДКРЫТ ФІЛІЯЛ
ЦЭНТРАЛЬНАЙ АПТЭКІ
ПА ПРЫЁМУ РАЦЭПТАЎ І ВОДПУСКУ ГАТОВЫХ СТАНДАРТНЫХ ЛЯКАРСТВАЎ.
Філіял адкрыт з 10 г. 30 м. раніцы да 8 г. 30 м. вечара.
МІНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ ГАЛОЎАПТЭКАЎПРАЎЛЕННЯ.

Праграма радыёперадач

(ст. РВ-10)

16 СНЕЖНЯ, ПАНЯДЗЕЛАК

00.07—Канцэрт. 11.15—Перадача аддзела партыйнай прапаганды. 17.05—Перадача для піянераў і старшых школьнікаў. Кедраў — «Цудоўная скрыпка». 17.45—Літаратурная перадача. Сулейман Стальскі — «Думы аб Радзіме». 18.15—Канцэрт беларускай музыкі. 19.30—Урыўкі з оперы Чайкоўскага — «Чарадзейка». 20.15—Лекцыя. «Шаснаццаты з'езд ВКП(б) —з'езд разгорнутага наступлення соцыялізма». 21.05—Літаратурная перадача. М. Горкі — «26 і адна». 21.50—Канцэрт.

17 СНЕЖНЯ, АЎТОРАК

00.07—Літаратурная перадача. Л. Н. Талстой — «Анна Каренина» (перадача 14-я). 01.00—Канцэрт. 10.00—Перадача для дзяцей — «Жыццё школы». 10.10—Перадача для дашкольнікаў. Апавяданні Прышвіна — «Ярык», «Гаечкі» і «Журка». 17.05—Канцэрт для дзяцей. 17.30—Літаратурная перадача. Ів. Новікаў — «Рассказ о прохожем». 18.15—Канцэрт польскай музыкі. 19.30—Артыкул: «Усе радачым штаты ў калгасах». 19.45—Шосты канцэрт з цыкла «Развіццё заходнееўрапейскага раманса». У праграме творы Шуберта і Вебера. 20.15—Лекцыя ў дапамогу вывучаючым марксізм-ленінізм. «14-ы з'езд партыі». 21.00—Перадача, прысвечаная вынікам выбораў дэпутатаў у мясцовыя саветы заходніх абласцей БССР (трансл. ст. РВ-95).

18 СНЕЖНЯ, СЕРАДА

00.07—Літаратурная перадача. Л. Н. Талстой — «Анна Каренина» (перадача 15-я). 01.00—Канцэрт. 11.00—Лекцыя ... дапамогу вывучаючым марксізм-ленінізм —«14 з'езд партыі». 17.05—Перадача для дзяцей. Разанаў — «Як рабіць елачныя ўпрыгожанні». 18.00—Канцэрт балетнай музыкі. 19.30—Гутарка «Навейшыя ... ныя навукі аб паходжанні чалавека». 20.00—Трансляцыя канцэрта з Ленінграда. У праграме: камерная музыка, ... матычная перадача «Балады» і эстрадны канцэрт.

Кафедра будаўнічых канструкцый Беларускага дзяржаўнага політэхнічнага інстытута
ПРАДАЎЖАЕ ў 1941 годзе ПРЫЁМ РАБОТ
па абследванню, кансультацыі і выпрабаванню ўстойлівасці канструкцый і збудаванняў
ПОЛІТЭХНІЧНЫ ІНСТЫТУТ АРГАНІЗОЎВАЕ ПРЫ КАФЕДРЫ БУДАЎНІЧЫХ КАНСТРУКЦЫЙ СПЕЦЫЯЛЬНУЮ ЛАБАРАТОРЫЮ ПА ВЫПРАБАВАННЮ КАНСТРУКЦЫЙ І ЗБУДАВАННЯЎ.
Па ўсіх пытаннях кансультацыі і выпрабаванню канструкцый звяртацца па адрасу: гор. Мінск, вул. Пушкіна, 40, Беларускі дзяржаўны політэхнічны інстытут, будаўнічы факультэт, тэлефоны №№ 22-256 і 24-587.
Кафедра кансультацый БДПІ.

МЯНЯЮ ў Маскве ПАКОЙ 18 метраў з пярэдняй у 12 метраў, усе выгоды, у центры, на асобную КВАТЭРУ ў Мінску. Званіць па тэлефону 23-561 з 7 г. 30 м. вечара.

ПРАДАЕЦЦА МАТАЦЫКЛ.
Даведацца па нядзелях з 12—17 гадзін па адрасу: Мінск, Тіфліская, 8, кв. 2.

АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАВЕЦТВА Мінск, Совецкая, 49. Тэлефоны рэдакцыі: адказны рэдактар — 20.000 (камутатар), дадатковы — 102 Прыёмная рэдактара — 2-13-52 Намеснік адказнага рэдактара — 2-51-89 Адказнага сакратара — 2-13-53 Намесніка адказнага сакратара 2-24-12 Сакратарыята — 2-39-55 Аддзелаў: заг партыйнага аддзела — 2-18-46 Літработнікаў — 2-13-56 Заг аддзела прапаганды агітацыі — 2-51-89 Заг эканамічнага аддзела — 2-08-30 Літработнікаў — 2-15-56 Літработнікаў па літаратуры і мастацтву школах і ваенна-фізкультурнай рабоце — 2-13 85 Унутранай інфармацыі — 2-13-60 Аддзела рабселькораў і пісем працоўных — 2-08-44 і 2-18-45 Заг. выдавецтва — 2-13-58 Бухгалтэрыі выдавецтва і аддзела аб'яў — 2-13-99 Выпускаючага — 2-47-68 Карэктарскай 2-13-57

У4955. Мінск, друкарня «Звязды», Совецкая, 49. Кр., Ш., Ш.